**Анатоль Трафімчык**

# ЛІРЫКА ЛІРЫКА

Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны
г. Баранавічы
2007

www.kamunikat.org

ББК 84.(4Беі)
Тр 65

Трафімчык Анатоль. Лірыка Лірыка. – Баранавічы :Баранавіцкая гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”, 2007. — 132 с.

ББК 84.(4Беі)

© Баранавіцкая гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”, 2007.

www.kamunikat.org

# З М Е С Т

Замест аўтарскіх уводзінаў
Сакраментальны трактат дылетанта
для дылетантаў, або Яшчэ раз пра каханне .... 7

## EROS

* * * “Кожную дзеўчыну хочу кахаць я” ........... 13
* * * “Убіцца б у гэтыя грудзі” ............................ 15
* * * “Пірамідкі грудзей тваіх” ........................... 15
Трыялет “Ах! Якія харошыя грудкі” ................. 16
Першае лета ў Мінску ...................................... 17
* * * “З глузду з’ехаўшы ад юру” ....................... 19

## V(ЯНО)К° РЭФЛЕКСІЙ

Рэфлексія пра левую грудку ............................ 20
Рэфлексія пра грудку японкі ............................ 21
Рэфлексія пра грудку
белай мядзведзіцы, і не толькі ....................... 22
Рэфлексія пра грудку бээнэфаўкі .................. 23
Рэфлексія пра грудку, з якой
сцякае кропля ліпеньскай навальніцы ........... 24
Рэфлексія пра грудку курыльшчыцы .............. 25

Рэфлексія пра грудку,
на якой павінна быць радзімка ........................ 26

## ЛІРЫКА ЛІРЫКА

Трыялет пра каханне ........................................ 29
* * * “На апошнім рандэву” ................................ 30
* * * “Давай пагуляем на могілках” .................. 31
* * * “Я прыйду да цябе апоўначы” .................. 33
* * * “Ты не Керн, а Каренина Анна” ................ 34
* * * “Мяне хутка аформіць лякарня” .............. 35
Postfactum ........................................................ 36
* * * “Перагарну каханне, бы старонку” ........... 37
* * * “Жывучы з прыродай не ў ладах” ............ 38
* * * “Скажаш мне звярнуць – пайду налева” . 39
* * * “У мяне ў кішэні драма” ............................ 40
Санет “Крануўшыся таго, чаго няма” .............. 42
* * * “Я не скажу арыгінальных фраз” ............. 43
* * * “Нашкрэбаць верш, не шкадаваць паперы” 44
Вясенні блюз .................................................... 45
* * * “Не варта ўсё напісанае мной” ................. 46
* * * “Прабач мне сантыментаў ноткі” ............. 47
* * * “Мы ўсе, паэты, – пашлякі” ....................... 50
Трыялет “Завеі эратычныя зімы” .................... 51

* * * “У пустой душы, як у трубе” .................... 52
Эпілог (пародыя на сябе) ................................ 53
P. S. ............................................................ 54
* * * “Вазьміце сягоння аўтограф” ................. 55
Малітва ..................................................... 56
* * * “Канае ноч барвовым даляглядам” ......... 57
* * * “Сапраўдныя вершы – не на паперы” ...... 58
* * * “Я не для вас, народ, о не!” .................. 59
Акрасанет
“Так прагну чысціні біблейскай цноты” ........... 61
Трыялет “Я памру – і патухне Венера” ........... 62
* * * “Такую больш мне не сустрэць” ................ 63
* * * “Пачуцці заглушу і боль знясу” ............... 64
* * * “Лячуся цыгарэтамі ды півам” .................. 65
* * * “На душы – маленечкая ранка” ................ 66
* * * “Я хачу цябе тамака” ............................. 68
* * * “Я не парушу твой спакой” ...................... 70
* * * “Прабач ты мне – дурню-паэту” ............... 71
Трыялет
“Каханне агеньчык ляжыць у кутку” ............. 72
* * * “Ціха падае дождж за акном” .................. 73
* * * “Не схаваць мне свайго адчаю” .............. 74
* * * “Якія правільныя формы!” ...................... 75
Акраверш ................................................... 76

Віка, Баранавічы і я ........................................ 77
* * * “Дазвольце, Ната” ...................................... 78
* * * “Твой кожны след увекавечыць” ............. 80
Акрасанет
“Душа душу так прагне зразумець” ................ 81
* * * “Ты. Прабач, адразу перайду” .................. 82
Паэма ............................................................. 84
* * * “Я прамяняў цябе на адзіноту” ................ 85
* * * “На мапе знямоглай душы” ...................... 86

## ТАБЕ

Трыялет “Давай з табою жыць і плакаць” ...... 87
Трыялет “Мне ўсё адно, чым быць лёсам” .... 88
* * * “Давай на шырокім ложку” ...................... 89
* * * “Восень стаіць на дварэ” ........................... 90
Трыялет
“Не спадзявайся, бо ты не памрэш” ............... 91
* * * “Ты маёй дачакаешся смерці” .................. 92
* * * “Нам лепей застацца на Вы” .................... 93

P. S. Раман у паэтычных фрагментах.............. 94

Кепская навела (ненапісаная элегія) ........... 105

# ЗАМЕСТ АЎТАРСКІХ УВОДЗІНАЎ

## Сакраментальны трактат дылетанта для дылетантаў, або Яшчэ раз пра каханне

*Любовь начинается в ту минуту, когда женщина своим первым словом впишется в нашу поэтическую память.*

М. Кундэра

Прысвячаецца А. –
дзяўчыне, што купаецца

Што ёсць каханне? Ці існуе яно наогул? Гэтыя і іншыя пытанні аб існаванні найвышэйшага пачуцця заўсёды турбавалі, турбуюць і будуць турбаваць чалавецтва ў цэлым і кожнага індывідуума асобна.

Як падае тлумачальны слоўнік, каханне – гэта «вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы іншага полу».

І вось паўстаюць пытанні, ці сапраўды існуе такое «вялікае сардэчнае пачуццё» і калі існуе, то як вызначыць яго межы? Разгортваючы гэтую думку шырэй, як вызначыць той дзівосны пункт, калі каханне, скажам так, пачынаецца і... заканчваецца?

Ніхто, думаецца, не будзе спрачацца, што каханне, калі яно ёсць (гэта ўмова будзе мецца на ўвазе і далей адносна паняцця «каханне» да поўнага вырашэння нашай праблемы), – пачуццё ірацыянальнае, невытлумачальнае. Значыць, вызначыць ступень пачуцця можна толькі адносна, ды і то з вялікай нацяжкай. Гэта будзе поўны суб'ектывізм. Колькі людзей, столькі і думак, сказаў нехта. Але яшчэ трэба дадаць, што ў асобнага чалавека таксама нельга знайсці дзве падобныя думкі ў працэсе эвалюцыі яго мыслення (нават праз секунду), хаця знешне (праз мову) яны (думкі) могуць выглядаць падобнымі, тоеснымі. Такім чынам, на маю думку, выявіць ступень «сардэчнага пачуцця», з якой пачынаецца каханне, практычна немагчыма.

Але навошта гэта наогул выяўляць? Тут пахне ўжо нейкім рацыяналізмам, калі не сказаць прагматызмам. Каханне ж нельга загнаць у нейкія штучныя рамкі. Узнікае пытанне: што тады ў прынцыпе прымаць за каханне? Першую сустрэчу з дзяўчынай (можа, і апошнюю)? Ці першы пацалунак (можна, і другі, трэці... у залежнасці ад вашай фантазіі)? Ці тое, што адчуў у расстанні, перапрашаю за банальнасць, немагчымасць далейшага існавання без Яе?

Паколькі, думаю, дакладнага адказу не можа быць, вызначымся для пачатку хаця б неяк аморфна, што, дарэчы, і будзе найбольш дакладна: за каханне трэба прымаць або ўсё вышэйпералічанае (калі каханне існуе), або – нічога (калі яго на белым свеце няма). У першым выпадку да кахання аднясём нават кароткачасовае «астыгматычнае» любаванне дзяўчынай, напрыклад, у момант яе купання (мы ж тады ні пра каго больш не думаем, а толькі «кахаем» тую, што купаецца), каханнем назавём і пачуццё да дзяўчыны, якое ўзнікае ў эратычным сне (па той самай прычыне) і г. д., і да т. п., не кажучы ўжо пра больш «маштабнае» (як здаецца знешне) пачуццё да той адзінай, без якой немагчыма жыць.

Але ж немагчыма жыць і без той, што купаецца, і без той, можа, зусім незнаёмай і нерэальнай, якая нечакана прыйшла ў дзіўным, але прыемным сне! Да таго ж у тыя моманты нават не думаецца пра тое, што немагчыма якраз без той – Адзінай. Адрозненне заключаецца толькі ў адрэзках часу, на працягу якіх узнікае пачуццё да розных дзяўчат, а зусім не ў нейкай там ступені, кшталту «вялікага сардэчнага пачуцця». Таму адносна глыбіні апісаных пачуццяў паміж імі можна паставіць знак роўнасці, тым самым або

пашыраючы ўяўленне пра каханне, напаўняючы гэтым паняццем амаль усё жыццё, або... цалкам выкрэсліваючы яго са свайго жыцця, так бы мовіць, выносячы яму смяротны прысуд. Бо калі не прымаць за каханне кароткачасовае «вялікае сардэчнае пачуццё», аўтаматычна (успомніце знак роўнасці) не могуць прымацца за каханне ўсе астатнія такія пачуцці, г. зн. не прымаецца само каханне як з'ява.

Выбар за вамі, сябры, ці, калі казаць больш дакладна, выбар залежыць ад вашага светаадчування (напрыклад, аптыміст-сангвінік, хутчэй за ўсё, будзе вечна закаханы і наадварот, але гэта ўжо тэма для іншай размовы).

Такім чынам, наяўнасць кахання як з'явы нашага жыцця кожны разумее індывідуальна: каханне або ёсць, або яго няма. Такое разыходжанне патрабуе аднаго-адзінага адказу. Па-першае, неваладанне гэтым пачуццём не ёсць абсалютная яго адсутнасць. (Як, даруйце за крыху няўдалы прыклад, неваладанне аўтамабілем не азначае яго неіснавання). Па-другое, многія прынцыпова прытрымліваюцца сцвярджэння аб адсутнасці кахання, бо калісьці самі яго перажылі, але яно аказалася нешчаслівым і пакінула глыбокі і разбуральны след у душы чалавека. Значыць, каханне існуе.

Таксама хацелася б агаварыць такія моманты, калі ў наяўнасці пачуццё ёсць, але яно ні ў якім разе каханнем не з’яўляецца, нават пры вельмі блізкіх адносінах уладальніка пачуцця і «асобы іншага полу». У гэтым выпадку той уладальнік можа быць рэзка эгаізаваны, засяроджаны на задавальненні сваіх патрэб (магчыма, не толькі цялесных, але і, такое таксама бывае, сардэчных), а «асоба іншага полу» тут выступае як аб’ект задавальнення, прычым на яе месцы можа быць амаль люб*а*я (люб*ы*) або вельмі многія, якія, аднак, не будуць для суб’екта л*ю*бымі. Такім чынам, важна, каб «вялікае сардэчнае пачуццё» было накіравана на нейкі аб’ект, які нельга было б абыякава замяніць менавіта ў час, калі кахаеш: напрыклад, у працэсе любавання дзяўчынай, якая купаецца, не хочацца бачыць іншую, а толькі яе, на той момант адзіную і каханую. Адсутнасць для суб’екта альтэрнатывы той дзяўчыне – пацверджанне кахання да яе.

Вось – таксама «вялікае сардэчнае пачуццё», праўда, вельмі непрацяглае ў часе, мімалётнае, момантавае, а таму яно памылкова і беспадстаўна каханнем не лічыцца. Але ніхто не будзе аспрэчваць таго, што, якім бы працяглым

ні быў перыяд сапраўднага кахання, ён усё адно падаецца момантам.

Відавочныя праявы кахання мы агаворваць не будзем, даказаўшы, што нават на першы погляд дробязныя і «невялікія сардэчныя пачуцці» такімі не з'яўляюцца, бо гэта таксама ёсць каханне.

Такім чынам, яшчэ раз і назаўсёды: КАХАННЕ ЁСЦЬ, ЯНО ЎСЮДЫ, ЯНО – НАШАЕ ЖЫЦЦЁ, А НАШАЕ ЖЫЦЦЁ – КАХАННЕ.

Не спрачайцеся, гэта сапраўды так, хоць у гэтым трактаце думкі і выкладзены сумбурна.

# EROS

*Coito ergo sum*

Лац. прым.

*...и тут –*
*тут конец перспективы.*

І. Бродскі

* * *

Кожнай дзеўчыне асабіста прысвячаецца
(каб не казалі, што я вам не прысвячаў вершаў)

Кожную дзеўчыну хочу кахаць я:
У полі, у лесе, у роднай хаце,
На даху, у склепе, пад возам, на возе,
На столі, на сценах альбо на падлозе,
На дрэвах, на небе, на голай зямлі… –
Абы толькі дзеўчыны *кожнай* былі.

* * *

Як гэта бывае,
зусім незнаёмым грудзям
прысвячаецца

Убіцца б у гэтыя грудзі
Ў лагчыне альбо на грудзе,
На траўцы ці нават на снезе,
Цалуючы колькі ўлезе,
Каштуючы кожную смочку,
Зубамі рвучы сарочку,
Сягаючы столі экстазу… –
Разоў гэтак сорак па разу.

* * *

Незнаёмай дзяўчыне
з электрычкі «Мінск – Брэст»
прысвячаецца

Пірамідкі грудзей тваіх
Абвастраюць мой зрок і слых,
Па адной ці, хутчэй, удзвюх
Робяць тонкім нармальны нюх
І гурманней – не знаю як –
Па-мужчынску галодны смак.

Дай убачыць мне іх бліжэй,
Дай гармонію іх пачуць,
Дай мне кожную з пары грудзей
Пакусаць і панюхаць па чуць.

Пірамідкі
грудзей
тваіх…
Аксаміткі
надзей
маіх…

## ТРЫЯЛЕТ

Незнаёмай дзяўчынцы з Хрэшчатыка
прысвячаецца

Ах! Якія харошыя грудкі
Ў прамільгнуўшай німфеткі-дзяўчынкі!
Я ля кожнай рабіў бы прыпынкі!
Ах! Якія харошыя грудкі!

Любаваўся б я цэлыя суткі,
А здалося б – не болей хвілінкі.
Ах! Якія харошыя грудкі
Ў прамільгнуўшай німфеткі-дзяўчынкі!



www.kamunikat.org

# ПЕРШАЕ ЛЕТА Ў МІНСКУ

Ходзяць дзяўчыначкі,
марляй прыкрытыя,
Ходзяць цнатлівыя
і не зусім,
Ходзяць прыгожыя,
Богам забытыя,
І кракадзільчыкі
з хлопцам сваім.

Ходзяць танклявыя,
ходзяць і мажныя,
З ножкамі доўгімі
ходзяць і не,
Ходзяць і простыя,
ходзяць і важныя,
Ходзяць і ходзяць, ды
не да мяне.

Свіцяцца майтачкі,
свіцяцца станікі,
І па-сяброўску
мігаюць пупкі.
Светачкі, Леначкі,
Ґанькі і Танькі –

Ўсе на адлегласці
дзесьці рукі.

Ходзяць дарослыя,
ходзяць і юныя,
Што любавацца –
ужо крымінал,
Ходзяць вясёлыя,
ходзяць і сумныя, –
Розным прызначаны
мой мадрыгал.

Мілыя, родныя,
вельмі жаданыя,
Покуль вы будзеце
шпацыраваць,
Мне дэманструючы
файныя даныя,
Не перастану
вас я жадаць.

* * *

З глузду з’ехаўшы ад юру,
Камячу тваю фігуру
І, нібыта самакрутку,
Я смакчу за грудкай грудку,
Языком старанна мыю
Аксамітавую шыю
І, уткнуўшы нос пад пахі,
Выцінаю жарсці пахі,
Прашаптаць мне нешта хоча
Твой гарэзлівы пупочак,
Ад яго кіруе сцежка
Ўніз, дзе розуму усмешка,
І ў нябесным захапленні
Я ліжу твае калені...

На прыгожым, зграбным целе
Ўсе прывабнасці паспелі,
Я ад мезенцаў да мочак –
Кожны паспытаў куточак.

# V(ЯНО)Кº РЭФЛЕКСІЙ

*А-эпіграф:*

*С улыбкой*
*Развязала кимоно*
*Но просишь отвернуться*
*Большие чувства*
*Маленькая грудь*

Рубако Шо

## РЭФЛЕКСІЯ ПРА ЛЕВУЮ ГРУДКУ

Мне чамусьці падабаецца левая грудка. Чаму левая? Не ведаю. Але гэты вывад я зрабіў з асабістых вопытаў. Я часцей дачэпліваўся да яе. Цалаваў. Менавіта левую. Вось вы паспрабуйце ўспомніць, якой грудцы ўдзялялі больш увагі, які смачок болей лашчылі. Упэўнены, за рэдкім выключэннем, вы такія, як я. Вы нават пагодзіцеся з тым, што левая грудка без правай выглядала б зусім неэстэтычна і не прываблівала б так апантана.

P.S. Адзінае адрозненне паміж мною і ўсімі астатнімі такімі, як я, заключаецца ў тым, што «Рэфлексію пра левую грудку» напісаў усё-такі я, а не яны.

## РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ ЯПОНКІ

Я хачу паглядзець на грудку японкі. Я хачу пакаштаваць яе смочку.

Мне здаецца, я б яе праглынуў і яна застрагла б тромбам у маім сэрцы, перакрыўшы шляхі згубы мужчынскае сілы.

Я хачу адчуваць пах, які зыходзіць з міні-Фудзіямы.

Я хачу ім атруціцца, каб ачомацца не меней чым у рэанімацыйным аддзяленні мінскай бальніцы.

Мне здаецца, з таго кратэру струменіцца водар сена, упершыню скошанага мною на поплаве маёй роднай, нікому невядомай Кудахі, спаласаванай меліярацыйнымі ізаглосамі; пах першай стограмоўкі, сарамліва выпітай у прысутнасці дарослых, і першай цыгарэты, выкуранай за вуглом з сябрамі, ад чаго ўсім стала крыху блага, але ніхто не прызнаўся ў гэтым нават самому сабе; нарэшце, пах старонак лемантара, змест якіх стаўся сродкам сублімацыі для выражэння таго незразумелага, што распаляе жаданне паглядзець на грудку японкі.

Дзякуй табе,
Краіна ўзыходзячага сонца,
за слаўную дачку твайго народа!

# РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ БЕЛАЙ МЯДЗВЕДЗІЦЫ, І НЕ ТОЛЬКІ

Я ведаю, што ніколі не пабачу яе, ні грудкі, ні белай мядзведзіцы, а таксама разумею тое, што гэтая «Рэфлексія» атрымаецца слабейшай за папярэднія. Аднак, нягледзячы на неспрыяльныя абставіны, уверцюру да задуманага твора я ўжо напісаў.

Тут нездарма выкарыстаны музычны тэрмін – гэта маё імкненне кампенсаваць адсутнасць у мяне нават сярэдняга слыху, што адбылося, магчыма, з-за мядзведзя, ускормленага аб'ектам майго літаратурнага твора. Так, чамусьці мне думаецца, што на маё вуха наступіў не наш родны беларускі мядзведзік, а менавіта белы велікан-прыгажун, хоць і гэтая версія можа не стасавацца з маёй арыгінальнай фантазіяй. Застаецца апошняя гіпотэза, што вінавата ва ўсім Вялікая Мядзведзіца. А прайшлася яна па маім органе слыху з-за помсты сваёй сяброўцы-суперніцы Малой Мядзведзіцы, пад сузор'ем якой я, хутчэй за ўсё, нарадзіўся і самая яркая зорка якой свеціць арктычнай фауне на чале з яе галоўным зверам. На жаль, ні тое кволае сяйва, ні магутная сіла гэтых радкоў не грэюць бедную жывёліну, якую я ніколі не ўбачу, не саграваюць яе грудку, якою можна было б даць жыццё

не аднаму таптуну вушак беларусаў дзеля іхняй жа самабытнасці.

А на завяршэнне скажу, што мяне цікавяць пытанні, якога колеру смачок у белай мядзведзіцы, а таксама, ці ёсць грудзі ў Вялікай і Малой Мядзведзіц, а як ёсць, які быў бы памер іх станікаў, калі б хто-небудзь змог пашыць такую бялізну.

## РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ БЭЭНЭФАЎКІ

Зразумела, гледзячы на яе, не ўзнікне і блізка асацыяцый з «Пагоняй» ці бел-чырвона-белым колерам. А калі, аднак, інстынктам (здаровым) усталюецца такая абстрактная сувязь, то гэта будзе перш за ўсё жаданне здзейсніць пагоню за нацыянальна свядомай дзеўчынай і напісаць на прасціне той непаўторны малюнак, якому пазайздросцілі б Рафаэль (у сэнсе працэсу творчасці) і Далі (у сэнсе выніку таго працэсу). Зрэшты, гэтая «Рэфлексія» магла б напісацца з аналагічнымі думкамі і пра бэрээсэмаўку. Чаму адбылося наадварот, вырашаць не мне, а Фройду, які, на жаль, даўно памёр, таму ніхто ніколі не даведаецца аб перадумовах стварэння «Рэфлексіі», хоць на першы погляд усё проста.

## РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ, З ЯКОЙ СЦЯКАЕ КРОПЛЯ ЛІПЕНЬСКАЙ НАВАЛЬНІЦЫ

Дождж застаў дзяўчыну ў чыстым полі, дзе й блізка не было месца схавацца. Гэта сталася нечаканасцю, бо шчэ нядаўна свяціла сонейка, выпрацоўваючы пігмент у маладым пяшчотным целе, большая частка якога бессаромна адкрывалася промням кароткай моднай маечкай і не менш кароткай спаднічкай. Неба зацягнула хмарамі раптам. Але прырода аказалася не ў сілах пакрыўдзіць сваю самую гарманічную частку Ї пятнаццацігадовае дзяўчо, чыстае і цёплае, бы навальнічныя кроплі. Прыгажунька ж, карыстаючыся адсутнасцю чужых вачэй, прамокшы да ніткі, вырашыла наогул скінуць маечку, якая толькі перашкаджала дыхаць на поўную грудку азонам. Навальніца сціхла таксама хутка, як і пачалася. А кроплі па-ранейшаму ўсё цяклі і цяклі, цалуючы аксамітную скуру…

Маё *паэтычнае* alter-ego пасля кожнай навальніцы марыць пра пераўтварэнне ў дажджавую кроплю, што сцякае па целе німфеткі. Аднак не ў адну з тых кропель, што неразборліва імкнуцца да не кранутага нікім трохкутніка, – такі пожад банальны для паэтычнай натуры, – а ў тую, адзіную і непаўторную, якая, пагладзіў-

шы тварык, вусны, шыйку, не сцякла па найбольш простаму, прымітыўнаму шляху, а, аблізаўшы сакральны ўзгорачак, мандражна завісла на яго самым апетытным месцы – на смочцы – дзеля таго, каб быць знятай адтуль языком майго *мужчынскага* alter-ego або, у крайнім выпадку, выпарыцца пад зноў выглянуўшым сонцам, каб да бясконцасці падпарадкоўвацца прыродным законам, паўтараючы апісаны рытуал пасля кожнай ліпеньскай навальніцы.

## РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ КУРЫЛЬШЧЫЦЫ

У інтэрнаце жыве дзяўчына, якую я часта (часцей чым каго з хлопцаў) бачу з цыгарэтай. Мой дарагі чытач, тут ты, мусіць, падумаў, што далей я буду маралізаваць. Не. Наконт гэтага я ліберал, бо сам цалаваўся не раз з дзяўчатамі, якія за момант да пацалунку трымалі ў губах цыгарэту. Проста я дзіўлюся здароўю чалавека, які столькі паліць (да таго ж дзяўчыны!) і хачу, каб вы таксама атрымалі такое ўражанне. У дадзеным выпадку здароўя трэба каб былі поўныя грудзі. А грудка ў яе невялікая. Аднойчы нават падумалася, што смачкі ў яе зялёнага колеру.

# РЭФЛЕКСІЯ ПРА ГРУДКУ, НА ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ РАДЗІМКА

Тая дзяўчынка з’яўляецца самай прыгожай німфеткай лета 2002 года і самым прыгожым стварэннем гэтага бясконцага і вечнага універсуму. Не апетытнай, не німфетачнай, бо такой у сілу сваёй падлеткавай фігуркі яна не была, а менавіта самай прыгожай. Ніколі не чакаў яе сустрэць у палескай глыбінцы. А калі ўбачыў, то ледзь не зваліўся з мапеда, на якім абганяў гожую кветку. Трохі пазней мы пазнаёміліся, і я атрымаў магчымасць візуальнай асалоды ад эстэтычнага згустку прыроды.

Тым часам дзяўчынка была ў сімпатычных шорціках, якія часткова прыкрывалі пекныя ножкі, не хаваючы, аднак, іх пекнасці і дасканаласці, у расхрыстанай кашульцы менавіта таго фасону, што мне падабаецца на дзяўчатах, пад кашулькай жа, якую прынцэса майго сэрца аднойчы на кароткі час скінула, была апранута лёгкая маечка, абрысы смачкоў на якой умомант рабілі мяне астматыкам.

Кожная часцінка цела дзяўчынкі была таксама самай прыгожай, але распавесці паперы хочацца перадусім пра тое, што стварала асаблівы шарм.

Трошкі ніжэй левага каленца ў дзяўчынкі знаходзіцца кропачка радзімкі – нюансік, які прыцягвае нейкай ірацыянальнасцю і надае ножкам вытанчаную зграбнасць боскай завершанасці. Пад праваю пахай, яшчэ не кранутай гармананальнымі наступствамі фізіялагічнага развіцця, месцяцца дзве такіх кропачкі, ад якіх душа мая тады прасілася ў псіхлякарню. І нарэшце апошняя, што была адкрыта маім вачам, – радзімка на левай шчочцы, якую казычуць няўрымслівыя пасмачкі дзяўчынкі-мары, круглы год гладзяць (часам зажорстка) ветрыкі і грэе сонейка. У маёй прысутнасці гэтая радзімка быццам бы смяялася разам з гаспадыняй, калі той было весела, засмучалася з ёю, калі тую спасцігалі моманты скрухі, і нават какетнічала.

Вось і ўсё, што мне пашчасціла бачыць. А сэрца... А сэрца ведае, што на адной з грудачак, бутончыкі якіх з'явіліся толькі сёлета, хутчэй на любімай левай, павінна быць радзімая кропачка, якая, каб я нейкім цудам змог яе сузіраць, стала б кропкай адліку майго вар'яцтва. Вар'яцтва ад прыгажосці, такой, якой – думаў я раней – не існуе, якой (ведаю цяпер) не існуе – для мяне.

P. S. Са шкадаваннем. У недалёкай ужо будучыні гэтыя радзімкі будуць цалаваныя-перацала-

ваныя. На жаль, не мной. І наўрад ці той іншы (ці іншыя) зможа ўбачыць і ацаніць талент прыроды, шарм яе тварэння, выяўлены праз радзімачкі, шарм, які на маім сэрцы ў сваім назове мяняе месцамі сярэднія літары.



www.kamunikat.org

*Шмат ёсць на свеце розных агнёў,*
*І кожным з іх заварожаны я –*
*Ваш пясняр.*

Максім Багдановіч

## Трыялет пра каханне

А. К.

Я ведаю, чым гэта скончыцца,
Нібы ўжо была рэпетыцыя:
Пякуча-халоднай крыніцаю.
Я ведаю, чым гэта скончыцца.

Хоць ведаць зусім і не хочацца,
Аднак не магу не скарыцца я.
Я ведаю, чым гэта скончыцца,
Нібы ўжо была рэпетыцыя.

* * *

А. К.

На апошнім рандэву
недзе страціў галаву,
і цяпер адно й жыву
ад званка да рандэву.
Лепей еў бы я халву,
ад якой ажно раву,
бо падобна на траву,
чым гуляў па рандэву,
дзе згубіў я галаву.

Гэты вершык не парву,
а цябе ім пазаву:
ты прыйдзі на рандэву,
пашукаем галаву.
А як не – то паплыву
на Украіну ці ў Літву,
да палякаў ці ў Маскву,
ці ў далёкую Туву
альбо кінуся ў дрыгву –
вельмі ж трэба ўсім наву-
коўцам меці галаву.

Дык прыходзь на рандэву,
покуль я яшчэ жыву.

* * *

А. К.

Давай пагуляем на могілках,
Успомнім пра тое, што будзе,
І вечарам ад знямогі
Заснём, дзе паснулі людзі.

Астатні праменьчык зарыва
Загубіцца ў кроне сасновай.
У сне пражыву я занава
Сюжэты старонкі новай.

У іх назаўсёды вернецца
З-за хмар цыгарэтнага дыму
Прыгожая дзеўчынка з сэрцам –
З Нямеччыны на Радзіму;

Акцэнтамі будзе какетнічаць,
Захоча ад генія сына,
І голас, пяшчотны і летні, не
Заглушыць часу машына.

Пачуецца ён і запомніцца
Тым геніем самым любімым,
Якога не грэе ўжо сонца,
Якога ахуталі зімы,

Які ўсю сваю дыялектыку
Балюча-бязглуздых сумневаў
Пакінуць хацеў бы на сметніку,
Нябачным з-пад сёмага неба.

А ў шчасце так проста паверыўшы,
Так лёгка прынесці на сметнік
Ахвярую лепшыя вершы
За голас – пяшчотны і летні!

...У сне, немагчыма прыстойным,
Як мрою – цябе – выдумляў.
Але прарываўся стогнамі
Пазычаны ў Кёльна умляут.

* * *

А. К.

Я прыйду да цябе апоўначы
Эратычным салодкім сном
І павісну ў цябе над акном
На ўсю ноч закаханаю поўняю.

Прылячу віртуальнаю мараю,
Пацалункам крануся вачэй,
Каб свяцілі каханнем ярчэй
Вочы мілыя, вочы карыя.

Напішуся цудоўнымі вершамі,
Ажыву на жаданых губах,
Атрымаўшы сакральны працяг,
І… не знікну з праменнямі першымі.

* * *

А. К.

Ты не Керн, а Каренина Анна,
Я ж не Пушкин і нават не Вронский,
Не цягнік і не лошадь Фру-Фру, –
Я герой не таго рамана,
Я герой не твайго рамана.
Все смешалось в доме Облонских,
Перабблыталася не ў пару.

Я спалю заканчэнне Талстога,
Напішу happy and рыфмаваны
І закіну яго ў Internet.
Няхай будзе шчаслівай дарога
Прыгажэйшай у свеце панны,
Самай лепшай у свеце панны,
Няхай стане шчаслівым свет.

Імя аўтара будзе забыта,
Не дадуць яму нават на піва,
Не паставяць каля Буало.
Перарабкі чакае «Лаліта»,
Аўтар новы адкажа шчасліва,
Што яго тут зусім не было,
Што мяне сярод вас не было.

* * *

А. К.

Мяне хутка аформіць лякарня
У свае саваны-нумары,
І пра нечыя вочы карыя
Дапамогуць забыць дактары.

Пазнаёмлюся там я з Леніным,
Сябруком стане Напалеон.
Ператворацца вусны Аленіны
У забыты няздзейснены сон.

Што ж, хвароба мая шчэ вылечная:
Толькі нейкі дзесятак сустрэч.
Успаміны – праблема не вечная,
Тэрапія прагоніць іх прэч.

Ачуняю ад гора-паэзіі,
Нат не ўспомню пра гэты радок…
Толькі рэха скупой парамнезіі
Нагадае пра твой язычок.*

---

*Версія апошняй страфы для дзяржаўных выдавецтваў:

Ачуняю ад гора-паэзіі,
Нат не ўспомню пра гэты радкі…
Толькі рэха скупой парамнезіі
Нагадае пра поціск рукі.

## Postfactum

А. К.

Самотным жаўранкам
з метафар Куляшова
Табе падвечар я пастукаю ў акно,
Ды не пазнаеш ты майго такога слова,
І застанецца толькі ў вершыках яно.

Мае ж пачуцці ператворацца у кроплі –
У слёзы, што застылі на тваім акне,
Дзе шыбы да мяне каханнем не прамоклі
І за якім, на жаль, не ўбачыш ты мяне.

Таму па гэтай найбанальнейшай прычыне,
Прыняўшы кроплі за звычайныя дажджы,
Акно сваё для жаўрука ты не адчыніш,
І будуць кропелькі да раніцы цячы.

* * *

Перагарну каханне, бы старонку
Любімай кнігі. Выпішу цытаты
У свой блакнот, зацёрты і памяты,
Каб цытаваць пры выпадку іх тонка,

Здзіўляць дзяўчат: які дасціпны розум
І выкшталцонасць пачуццёвых густаў!
А за душой няўрымслівa і пуста,
Бы абчытаўшыся бульварнай прозай.

Забыўшыся на статус чалавека,
Дэзінфецырую гарэлкай ранку,
А зранку
Мяне пакліча зноў бібліятэка.

* * *

D. D.

Жывучы з прыродай не ў ладах,
Выдумляю сам я поры года:
Заблудзіўшы мо, выводжу шлях
Да вясны, а да зімы – прырода.

Адсвістаў рулады ліставей,
Завіруха снежыцца пасажам,
Ува мне ж фальцэтам салавей
Пра пачатак самы лета кажа.

І на даляглядзе  – без аблок,
Я амаль забыўся на аблокі.
Дзіўны колер неба ловіць зрок:
У маёй пары ён вішнявокі.

Хоць нямала дзіўнага цяпер.
(У чужой зіме ці ў леце – дзе я?)
Хай не спакушае Люцыфер,
Бо з’явілася ў мяне надзея.

Мне прыносяць тысячы самот
Праз мінор-пасажы тыя зімы,
Ды ўцяку і буду круглы год
З Лецейкам сваім я, а не з імі.

* * *

D. D.

Скажаш мне звярнуць – пайду налева,
Хоць і трэба будзе напрасткі.
Скажаш з’есці плод з пазнання дрэва –
Я вазьму яго з тваёй рукі.

Скажаш быць у ролі Праметэя –
Буду, не спужаюся багоў:
Назаўжды прыкуты да цябе я,
Прыкаваць багі не змогуць зноў.

Скажаш – стану я Зефірам-ветрам,
Ты – Эол, і будзеш гнаць скарэй
Свой сюрпрыз, а мой пунсовы ветразь
Да Асоль, – пад ім жа плыў бы Грэй.

Скажаш: «Не спявай мне болей песню!
Не магу яе зусім трываць!»
Толькі песня… ўсё адно ўваскрэсне,
Моўчкі буду ўсё адно спяваць.

Скажаш… Толькі, толькі гавары ты,
Я адно з табой на вышыні.
Словамі тваімі я спавіты,
Імі шчэ, прашуся, агарні.

* * *

Мікалаю ВАКУЛІЧУ

*Жизнь, по-моему,*
*это дарёный конь.*

Д. Сэлинджер

У мяне ў кішэні драма.
Памяняць хачу яе
Я на яблык у Адама,
Ды ў ёй дзеяў не стае.

А да яблыка далей шчэ,
Чым ісці па далягляд.
Стала б тая драма вершам,
Вершык несці быў бы рад.

Стала б тая драма фарсам
Ці камедыяй якой.
Ды да фарсу, бы да Марса,
Мы ж прыгнечаны зямлёй.

Тая драма – падарунак,
Нельга ў зубы ёй глядзець.
Лепш з дзяўчынкай, вабнай, юнай,
Драматычна пасядзець.

Падмяніўшы драму лірыкай:
Я кахаю Вас… люблю… –
Можа, праз кішэню з дзіркай
Драму тую дзе згублю.



www.kamunikat.org

## Санет

N. P.

Крануўшыся таго, чаго няма,
Куды пранікнуць хочаш, ды не можаш,
Я зразумеў: стварыў Сусвет ты, Божа,
Дзе *неученье – свет*, *ученье – тьма*.

Вяртаюся паволі, бы слімак,
З вялікага да цемры бездарожжа
І ведаю: ніхто не дапаможа
Ні там, ні тут знайсці, чаго няма.

Без усялякай радасці, адчаю –
Мо па інерцыі, мо не – шукаю.
Ды тоеснасць адсутнага таго
Не кампенсуе й блізка ўсю адсутнасць.
І толькі ты – замена усяго,
І нават не замена, нават – сутнасць.

* * *

Я не скажу арыгінальных фраз,
Прызнаюся ў каханні досыць проста.
І на шляху да сціплага пагоста
Je t’aime я прашапчу яшчэ не раз.

Шэдэўраў я ніколі не ствару,
Іх знішчыць маю шанцаў небагата,
Спазнаўшы потым славу Герастрата, –
Сплыву у нежыццёвую пару.

Сярод сяброў – ніводзін не Дантэс.
Наўрад ці буду жыць я ў «Англетэры».
Не спраўдзяцца біблейскія намеры
І спадзяванні, што за полем – лес.

Усё ж абмежаванасць вечных тэм
Заўсёды вымушае йсці на выбар:
Як адчуваць, то лепей толькі Liebe,
Як гаварыць, то лепш за ўсё je t’aime.

* * *

N. B.

**Н**ашкрэбаць верш, не шкадаваць паперы,
**А**трамант ёй пакінуць як сляды –
**Т**ады ўвесь свет становіцца мне шэры,
**А** мне не трэба свет такі тады.

**Ш**ляхетнасць проста выкіну за дзверы
**А**скепкамі шматслоўнае руды,
**Я**кая, не прыводзячы да веры,
**Ц**ярушыць на гісторыю гады.

**Я**шчэ прыклеяць да сцяны шпалеры,
**Б**ез нас паўстануць дзесьці гарады,
**Е**вангеліст засне на Люцыферы, –
**К**алі не будзе зноўку, як тады…

**А**днак хачу сказаць зусім не тое,
**Х**аця і тое ёсць у галаве.
**А** хтосьці, можа, сярод нас з табою
**Ю**рлівым акраверш мой назаве.

## Вясенні блюз

У рытмах вясенняга блюзу
Складаю жаданні свае,
І сонечны погляд ілье
Мне ноты найлепшае з музык.

І таньчыць асфальт пада мною,
Трапляючы ледзьве у такт,
І піша нябачны мастак
Не фарбай, а пекнай вясною.

Вятрыска матывы асвежыць
Акордам юначай пары,
Які ты на слых падбяры
І выйдзі за рамкі і межы.

І выйдзі ў адкрытае мора,
Русалку са дна спакусі,
Зрабіўшыся раптам для ўсіх
Калумбам і блюз-дырыжорам.

І казка рэальнасцю стане
Да самых магчымых распуст:
Пад гэты няўрымслівы блюз
Народзіцца суперкаханне.

* * *

М. М. М.

Не варта ўсё напісанае мной,
Не варта тое, што не напішу я,
Лісточка нават пад тваёй нагой,
Якога… не прыкмеціш, не пачуеш…

Не варты я расіначкі малой
З яе вясёлкаю – сваім Сусветам,
Які ты знішчыш лёгкаю рукой,
Сама зусім не знаючы пра гэта.

Не варта ўсё! І нават вобраз твой,
Што засвяціўся ў вершах паратункам,
Калі мяняць, быў зменены б з ліхвой
Тваім адзіным толькі пацалункам.

www.kamunikat.org

### * * *

М. М. М.

*Яна была ў лёгкім паліто,*
*праз якое вясновым полымем*
*святлелі рамонкавыя грудзі.*

Л. Дранько-Майсюк

Прабач мне сантыментаў ноткі
І гэты рыфмаваны плач
З адценнем лёгкае эротыкі,
І ўсё астатняе прабач.

Зайздросціць я не перастану,
Здаецца, драбязе любой:
Калі кранецца ветрык стану,
Бы загуляўшыся з табой.

Зусім ён можа распусціцца –
Нахабнік-вецер – і падняць
Тваю кароткую спадніцу,
І мусіш ты яго стрымаць.

А ён адно ўсё: лашчыць ножкі
І хоча ўсю цябе раздзець…
Тады я мару хоць бы трошкі
З таго, што мае ветрык, мець.

Зайздрошчу сонечнаму дыску.
Ён погляд свой нясе з нябёс
Туды, куды мой погляд блізка
Ніхто й ніколі не занёс,

І песціць ён і песціць будзе
Заўсёды маладосць тваю –
Твае рамонкавыя грудзі.
Я шкадаванне затаю,

Што нават сонца бессаромна
Цяплом кладзецца на плячах,
У ход пусціўшы рукі-промні,
А мне ж такі закрыты шлях.

Калі захочаш ты схавацца
Ў адзенні зімняю парой,
Што ветру з сонцам не дабрацца,
Каб зноў павабіцца з табой,

Мароз тады зусім не груба,
Але настойліва, пачне
Шчыпаць цябе за шчочкі, губы…
Зноў стане зайздрасна тут мне,

Што ты ад пацалункаў гэткіх
Бы засаромеешся ледзь
І шчочкі – медныя манеткі –
Не могуць каб не чырванець…

Не перастану я зайздросціць.
За гэта ты ўжо мне прабач –
Не ад нянавісці ж і злосці
Узнік мой рыфмаваны плач.

* * *

М. М. М.

Мы ўсе, паэты, – пашлякі
Ад дотыку Яе рукі,

Ад погляду Яе вачэй
Юрлівасць думак апячэ,

А ўжо ад водару Яе
Дыхання ў лёгкіх не стае,

У рытмы сэрца ўносіць шок
Яе сінхронны лёгкі крок,

Хмяліць не толькі пашляка
П'янкі абрыс Яе смачка, –

А мы, паэты, – пашлякі,
Аб чым і пішуцца радкі.

## Трыялет

М. М. М.

Завеі эратычныя зімы
Сакавіком пачуцці закружылі.
І – нонсенс – закіпелі ў кожнай жыле
Завеі эратычныя зімы.

Мой трыялет, па сутнасці, нямы,
Канстатаваць ён толькі факты ў сіле:
Завеі эратычныя зімы
Сакавіком пачуцці закружылі.

www.kamunikat.org

* * *

М. М. М.

У пустой душы, як у трубе,
Той, што доўга гукаў не адпусціць,
Будуць плакаць вершы па табе,
Іх радкі скакацімуць чамусьці
Пад непаслухмянаю рукой:
Быццам пачуцця кардыяграму,
Выведзе атрамантам настрой
Гукаў тых сентыментальных гаму.

## ЭПІЛОГ

(пародыя на сябе)

### Трыялет

Прайшла зіма – і сціхлі ўсе завеі,
І вершаў пошчаку ўжо не чутно,
І канстатуе трыялет адно:
Прайшла зіма – і сціхлі ўсе завеі.

Ды з гэтага на сэрцы не цяплее.
На жаль, вясной не грэецца яно.
Прайшла зіма – і сціхлі ўсе завеі,
І вершаў пошчаку ўжо не чутно.



www.kamunikat.org

## P. S.

### Трыялет

М. М. М.

Маё сэрца здзіўляецца хвалям,
Мне здавалася, мёртвага мора!
Ды сягоння ізноў, як учора,
Маё сэрца здзіўляецца хвалям!

Хоць яны ад мяне не схавалі
Іх узнёсла-нязлосных дакораў,
Маё сэрца здзіўляецца хвалям,
Мне здавалася, мёртвага мора!

* * *

Вазьміце сягоння аўтограф
У зноў маладога паэты,
Бо постмадэрновы фатограф
Спыніў нам і вёсны, і леты;

Учытвацца будзеце потым,
Каля дваццаць пятага кадра,
Калі абліваецца потам
Пагонь месяцовая квадра;

На подпісы раскупіце
Наклад невялікі(-ай) кніжкі
І йдзіце пабавіцца ў жыце
Да прабеларускай малышкі.

## Малітва

Вазьмі сваім целам часцінку мяне
І кропелькай поту яе ажыві, –
Ізноў a la guerre, нібы на вайне,
Вар'яцкая прага нявіннай крыві.

Адно тваё слова – і я на шчыце,
Тады ўжо не cogito ergo sum,
Тады ўжо няхай і трава не расце,
Хаця і чакае наперадзе сум.

Ды гэтага я не ведаю шчэ,
Прашу і спагады, і цеплыні,
Якая ў Аідзе мяне апячэ,
Згараць мае крылы на вечным агні.

Пакуль мы Dasein, часцінку вазьмі ж,
Мой скрылік душы ў сваім сэрцы пакінь, –
І разам са мною туды паляціш.
Так хочацца разам.
Даруй.
Амінь.

* * *

Канае ноч барвовым даляглядам.
Плыве мой час. Ну, што сказаць? Плыві!
Канае ноч барвовым даляглядам –
Калюгай церпкай боскае крыві.

Мальберт прытуліць фарбы ў стылі рэтра
І загарыцца. Што сказаць?.. Гары!
Такі пажар не сапсуе паветра.
Мальберт прытуліць фарбы да пары.

Мальберт парваць мы з Ёю захацелі.
Я Ёй сказаў (а што сказаць?): парві!
Мальберт ёсць прафанацыяй пасцелі
Са следам церпкай боскае крыві.

* * *

Сапраўдныя вершы – не на паперы,
На мёртвай паверхні – попел і рэха
Таго, што ніколі не хоча не верыць,
Каб з глузду ад прозы і драмы не з'ехаць.

Сапраўдныя вершы – заўсёды навокал,
Здараюцца, праўда, прабелы і зеўры,
Чытае маё паэтычнае вока
Між складак прасціны
хмяльныя шэдэўры.



www.kamunikat.org

## * * *

*Mihi ipsi skripsi**

Ф. Ніцшэ

*Я не для вас, паны, о не!..*
*А я для бедных і загнаных...*

Янка Купала

Я не для вас, народ, о не!
Я не для бедных і загнаных,
І вы не ўбачыце мяне
Сярод пісьменнікаў прызнаных.

Сярод прызнаных. Бо яны
Для вас пісалі – кан'юнктура!
І нат эліта і паны
Не вабяць слова трубадура.

Я крыкну нават Богу: Ты
Пазакрываў усе вальеры
І атруціў усім раты,
Бо Ты не Моцарт, Ты – Сальеры!

Я не для вас! Я – для сябе!
Жыву, твару, памру мо нават
Не ў вашай пошлай барацьбе,
Не з вашай трывіяльнай славай.

---

* Я пішу сам для сябе

Я не для вас!.. Сусвет, даруй! –
Скажу хоць слова ў апраўданне.
Калі сябе я й падару,
То толькі аднаму – **КАХАННЮ**.



www.kamunikat.org

## Акрасанет

**Т**ак прагну чысціні біблейскай цноты
**А**льбо з табой сядзець у стоме дзён –
**Н**астолькі тоесным той сэнс відзён,
**І** не чутно ні смутку, ні самоты.

**А**дкрытыя спакусы і цянёты
**Д**алей бы не прыносілі свой плён,
**Т**аму што б немагчымым стаў праклён.
**О**, Госпадзе, адкрыў душы святло Ты.

**Л**юбіць Яго – глядзець магніт вачэй
**І** слухаць вуснаў рытміку размовы, –
**В**адой свянцонай робяцца ўсе словы,
**Е**русалім становіцца бліжэй.
**Р**асціце ж парасткі святла такога,
**Ш**ануй ты іх, душы маёй знямога.

## Трыялет

Я памру – і патухне Венера.
Кажуць, падаюць зоркі тады,
Калі хтосьці адбыў тут гады.
Я памру – і патухне Венера.

І прытуліць Ісуса папера,
Ёй пакіну такія сляды:
Я памру – і патухне Венера.
Кажуць, падаюць зоркі тады.



www.kamunikat.org

* * *

S.

*Глядзела на яго сінё і празрыста*
*і ўсміхалася ружовым прыпухлым роцікам.*
*З відавочным падкусам,*
*але адначасова і з адценнем заахвочвання.*

У. Караткевіч

Такую больш мне не сустрэць,
Бо так здараецца аднойчы:
Сінё, празрыста так глядзець
Не ўсіх дзяўчатак могуць вочы.

Я погляд той не зразумеў,
А ён, застаўшыся далёкім,
Дзвюма валошкамі сінеў,
Блакітам клікаў за аблокі.

Ды мне – прагматыку – былі
(Хоць адчуваў: раблю не тое)
Чужымі сінія палі,
Блакіт, валошкі – ўсё чужое…

А сёння… Сёння ўсё ўсплыло
І нават стала крыўдна трошкі:
Якое ж дзіўнае святло
Дарылі сінія валошкі!

* * *

S.

Пачуцці заглушу і боль знясу
Маіх з табой адносінаў няўдалых.
Аб гэтым нагадае толькі сум
Тваіх вачэй, прыгожых і адданых.

Ды гэта будзе сум самотны мой,
Хоць у вачах тваіх ён адаб'ецца,
Хоць можа бліснуць ён на іх слязой,
Але ў душы тваёй не знойдзе месца.

К табе ён зойдзе – выпадковы госць,
Ды высахне, нібы вясною слота,
І сумную пакіне прыгажосць,
Што не назваць прыгожаю самотай.

Не будзеш сумаваць, і не чакай:
Табе да восені яшчэ далёка,
Яшчэ наступяць красавік і май,
Шчэ будзе летняя пачуццяў спёка.

Не бойся ты, не праміне цяпло
(Хаця яго заўжды здаецца мала),
І ты не ўспомніш, як і не было,
Маіх з табой адносінаў няўдалых.

* * *

*Першапачатковы эпіграф:*
*Мы хварэем на душу.*

Толька Кругавец

Лячуся цыгарэтамі ды півам.
Спытаеце, на што ж я захварэў? –
Заўчасна я жыццём перагарэў:
Удалым – вашым і сваім – шчымлівым.

І глобус мой кружляецца панура.
Спытаеце, вакол чаго ж тады? –
Кружляецца, як кажуць, ад балды –
Такая, так бы мовіць, кан’юнктура.

…Пісаў я вершык у бібліятэцы,
Ды тут зайшла німфетак чарада, –
Я зразумеў: якая ж ерунда
Мае радкі, як сэрца ўстрапянецца.

* * *

Леаніду ДРАНЬКО-МАЙСЮКУ

На душы – маленечкая ранка,
Ды яе не вылечыць урач.
Толькі маладая куртызанка
Мне суцішыць мой стракаты плач.

Мо хоць не на доўгую хвіліну
З той ультражыццёвае ракі
Вырвуся, не забяру, пакіну
І забуду вершыкаў радкі.

Ды мяне ізноў, ва ўсякім разе,
Нейкай сілай падштурхне да вас:
Хоць я забываюся ў экстазе,
Толькі з вершам экстра-мой-экстаз.

Бо пасля, успомніўшы як прыкрасць
Тых маіх паводзін прымітыў,
Чую паэтычную нязвыкласць,
Адваротны пішучы матыў.

Так жыву: у некалькіх сюжэтах,
Маю не адзін сапраўдны твар
І сябе шкадую, не-паэта,
Не шкадуючы сваіх ахвяр.

Так патухну, як патухне сонца,
Я мінуся – бедны імартэль.
Як гарэць, то ўжо гарэць як творца,
А згасаць – хаця б як Рафаэль.

www.kamunikat.org

* * *

*Я шмат чаго мог уявіць, але толькі не беларускамоўную прастытутку.*

Зм. Бартосік<br>«Народная Воля»<br>13 кастрычніка 1998 г.

Я хачу цябе тамака,
я хачу цябе тутака,
Пан’юрліваю смагаю
перасохлі мазгі,
Патрыёткай адданаю
ты прыйдзі, прастытутка,
Беларускаю моваю
мо пазбавіш тугі.

Праспяваеш народную,
ці «Раманс» Багдановіча,
Ці раскажаш гісторыю
пра часы БНР,
Я ж паведаю, любая,
аб Вялікіх Круговічах,
Аб Вялікіх Круговічах,
скуль пішу я цяпер.

І якое прывабнае,
і якое прыгожае

Наваколле палескае
ад зямлі да нябёс,
Не стае толькі гурыі –
замяніць яе зможа
Беларуская грацыя –
для цябе такі лёс.

Я хачу цябе тутака,
у Вялікіх Круговічах,
На прыродзе разложыстай
ад душы разлажыць
І пад зоркай любімаю
песняра Багдановіча
Буду жыць з табой, мілая,
пяць хвілін буду жыць.

Але ж дзе патрыётачка
з вельмі смелаю знешнасцю,
За якою стаілася
падазронае «бел.»? –
Падалася, цнатлівая,
толькі вонкава грэшная,
У пару фантастычную,
у сваё ВКЛ.

* * *

Т.

Я не парушу твой спакой,
Бо ты парушыць не дазволіш,
Бо ты сваёй не зменіш ролі,
Прызначанай табе сям’ёй.

Бо для цябе сям’я – жыццё,
Адна яна на першым плане…
Шкада, што на мяне не глянеш
Ты з самым цёплым пачуццём.

За кожны погляд гэткі твой
Табе дарыў бы я па ружы…
Але я шчасця не парушу,
Я не парушу твой спакой.

* * *

N.

Прабач ты мне – дурню-паэту.
Стварыў я наіўнасці свет.
Свет зараз разбураны гэты,
І дурань ужо не паэт.



www.kamunikat.org

## Трыялет

Каханне агеньчык трымціць у кутку.
Чакае чагосьці, забіты, забыты.
Нагадваюць саван былыя ланіты –
Каханне агеньчык трымціць у кутку.

Уцёк ад дабра, і ад зла убаку,
І просячы, можа, апошняй Лаліты,
Каханне агеньчык трымціць у кутку,
Чакае кагосьці, забіты, забыты.

* * *

Ціха падае дождж за акном.
Надыходзяць ізноў успаміны,
Толькі слова трывожыць адно –
Кінуў.

Што ж цяпер наракаць мне на лёс:
Вінаваты я сам у гэтым,
Што кахання таго не прынёс
З лета.

Больш няма таго лета, цяпла,
Больш не гладзіць твае мне косы…
Эх! Чаму ж ты так рана прыйшла,
Восень?

Як шкада, не сустрэнем мы зноў
Тых світанкаў…
І толькі панура
Скажа дождж, што імжыць за акном:
«Дурань!»

* * *

Прыгожай выкладчыцы
Святлане Сяргееўне
быццам бы з нагоды заліку

Не схаваць мне свайго адчаю,
Не схаваць мне сваіх цяжкіх дум,
Ды і я іх зусім не хаваю,
А прад Вамі радкамі кладу.

Вы прабачце, я мо нетактоўна
Паступаю, што верша пішу,
Бо ўсё роўна (шкада, што ўсё роўна)
Не крану ім я Вашу душу.

Гэтым вершам я выклічу, можа, –
Хоць за шчасце і гэта прыму –
Толькі ўсмешку, надзвычай прыгожую,
Што прызначана мне аднаму.

І дадам яшчэ жартам два слоўцы.
Хоць залікі прасіць не прывык,
Папрашу: у маёй залікоўцы,
Калі ласка, пастаўце залік.

* * *

Незнаёмай дзяўчыне з гістфака БДУ
на семінары ў аддзеле рэдкай кнігі
Нацыянальнай бібліятэкі 4.XI.2003

Якія правільныя формы!
І ямкі на шчаках!
І толькі дзень мой чорны-чорны
Стаміўся іх чакаць.

Уецца кудзер над радзімкай.
І боскі росчырк броў.
А сэрца б’е аб грудзі дзіка
І закіпае кроў.

Пастава, міміка і жэсты,
І ланцужка ручай,
І... Толік, не туды залез ты! –
Спыніў пагляд адчай.

Сядзіць перада мной Багіня.
Я для Яе ніхто.
Душа мая, відаць, загіне
Праз гэта хараство.

## Акраверш

**Ж**ыла сабе ў Баранавічах Жэня.
**Э**кзамены здала – і пастуліла
**Н**а маркетолага, без запрашэння
**Я**на прайшла, без цяжкасцей і мыла.

**П**ачаўся час вучобы ва ўніверы,
**Л**юбілі адпачынак на прыродзе,
**Ю**лілі ад заняткаў не без меры,
**С**учасна апраналіся, па модзе.

**Т**ам быў яшчэ гісторык для прыліку.
**О**го! – казалі пра яго з павагай.
**Л**ірычна-іранічна і без крыку,
**Я**к мог, звяртаў ён Жэні той увагу…

## Віка, Баранавічы і я
## (акраверш)

**М**ясцовы правінцыйны каларыт.
**І** горад, безнадзейна перспектыўны…
**Л**яжыць на небасподачку паўгрыўны
**А**скепкам долі, цьмянай, як нябыт.

**Я**шчэ жыве ў прасторы гэтай час,
**В**акол трымцяць і страхі, і пачуцці,
**І**рдзее нехта ў профіль і анфас,
**К**удысьці рвецца сэрца з каламуці.

**А** недзе, пэўна, ёсць і іншы бок –
**С**усвет, прасцейшы, ясны больш і мілы.
**Л**аскава свецяць зорачкі здалёк,
**І**м не стае пяшчоты ўсё ж і сілы

**П**рыйсці на дапамогу да зямлян –
**Ч**акаць стаміўся горад у наіве.
**У**сё мінецца… Неспакойны стан
**К**іруе да прагалу ў перспектыве.

* * *

*Скажите, пожалуйста, небу,*
*чтобы оно больше не плакало,*
*а то я могу заболеть.*
*Я соскучилась по солнцу.*

Ваша Ната

Дазвольце, Ната,
я стану сонцам!
Для Вас – прыгожай,
такой самотнай.
Свяціць я буду
не дужа моцна,
Але сагрэю
сваёй пяшчотай.

Дазвольце, Ната,
мне дакрануцца
У снах, у мроях,
у шчырых марах
Да Вас, цнатлівай,
святлом палюцый,
Святлом ілюзій
жаданняў марных.

Дазвольце, Ната,
прасіць дазволу
На ўсе без глузду
мае надзеі.
Хачу выконваць
я Вашу волю,
Вас грэць душою,
а дзе – і ў дзеі.

* * *

*Я – убожество. Ты – Божество!*

Игорь Шкляревский

Твой кожны след увекавечыць
Хацеў бы вершыкам сваім.
Твой след – як свет, агонь і дым,
І дом, дзе грэю ся на печы.

І слова кожнае тваё мне
Хацелася б крануць губой
І языком, каб змог запомніць
Твой смак і смех, і жыць – табой.

Твой кожны жэст і кожны рух твой
Зарыфмаваць, уклаўшы ў троп, –
І можна жыць – над сіняй бухтай,
Без рыфм, алюзій, лішніх стоп.

## Акрасанет

**Д**уша душу так прагне зразумець,
**А**днак, на жаль, не знойдзе разумення.
**М**алітвы крок насустрач не заменяць,
**І** не купіць яго за срэбра й медзь –

**Л**юбоў любові можа не сустрэць.
**А**дно пакіне па сабе найменне
**Й** гульню актораў на згарэлай сцэне.
**Н**а жаль, яна не зможа іх сагрэць.

**А**дкрыйся – словам, хоць няўдалым, ды
**Т**акім, каб шчырасць напаткала
шчырасць –
**А**сновай стала для палёту ў вырай, –

**Ч**ым жыць сярод хлусілівасці й нуды,
**К**алі не хочацца да іх туды,
**І**дзі й глядзі на свет на гэты шырай.

* * *

*Я вас любил. Любовь еще (возможно,*
*что просто боль) сверлит мои мозги,*
*Все разлетелось к черту, на куски.*
*Я застрелиться пробовал, но сложно*
*с оружием. И далее, виски:*
*в который вдарить? Портила не дрожь, но*
*задумчивость. Черт! все не по-людски!*
*Я Вас любил так сильно, безнадежно,*
*как дай Вам бог другими – но не даст!*
*Он, будучи на многое горазд,*
*не сотворит – по Пармениду – дважды*
*сей жар в груди, ширококостный хруст,*
*чтоб пломбы в пасти плавились от жажды*
*коснуться – «бюст» зачеркиваю – уст!*

И. Бродский

**Т**ы. Прабач, адразу перайду –
**А** пазней жа лепей, чым ніколі –
**Ц**іхім акраголасам на du
**Ц**і на ты, змяняючы паролі.

**Я** сумую. Па табе – не Вас:
**Н**е па Вашай злосці і капрызах,
**А** па тых тваіх найлепшых рысах,
**В**ашага ў якіх няма якраз.

**А**дышлі ва ўчора ты і Вы,
**С**пакайней, аднак, мне жыць не стала,

**І** кахаю вобраз твой жывы,
**Л**етучы цяпер за ім з астрала.

**Е**дкасцю прасякнуты другі –
**В**аш калючы і халодны вобраз,
**І** тады мяркую ўжо, што добра ж
**Ч**уць з учора пошчакі тугі.



www.kamunikat.org

## Паэма

т. w.

ЛЮ-
БЛЮ



www.kamunikat.org

* * *

A. L.

Я прамяняў цябе на адзіноту.
І не шкадую шыла й мыла, бо й
майму цячэнню ці майму палёту
не ўгнацца пры падзенні за табой.

Прабач, і будзь шчаслівая. Прынамсі,
тэарэтычна ўсё магчыма. Ды
судзіць адзін аднога ўжо не нам. Ці,
магчыма, адмянілі ўсе суды.

Канешне, застаецца сверб і мленне,
але яны лягчэйшым друзам, чым
каханне (што было ім). І табе не
аспрэчыць тога. Лепей прамаўчым.

Бывай, каханая! Бывай каханай!
Няхай тваім каханым нехта бу-
дзе ў гэтым свеце трохі з меншай ранай.
А мне? Даруй мне, Божаму рабу.

* * *

*У адну раку нельга ўвайсці двойчы.*

Геракліт

На мапе знямоглай душы
Каханне ізноў напішы.

Стары Карфаген разбуры,
Гары дагары, да зары.

Маштаб герастрацкай мяжы
Ты мапе сваёй навяжы.

Тады пазбіраеш шчыты
І будзеш адзінкаю ты.

Сярод парыжэлай травы
Цябе ўжо паклічуць “на Вы”.

Але ты кахай – і тады
Ізноў пакаштуеш вады.

# ТАБЕ

*Мой голос, торопливый и неясный,*
*тебя встревожит горечью напрасной,*
*и над моей ухмылкою усталой*
*ты склонишься с печалью запоздалой,*
*и, может быть, забыв про все на свете,*
*в иной стране — прости! — в ином столетьи*
*ты имя вдруг мое шепнешь беззлобно,*
*и я в могиле торопливо вздрогну.*

И. Бродский

## Трыялет

Давай з табою жыць і плакаць,
Смяяцца потым да істэрык...
Украўшы лёгкасць у Кундэры,
Давай з табою жыць і плакаць.

Калі захочацца нам веры,
Нас паглыне пасцелі мякаць.
Давай з табою жыць і плакаць,
Смяяцца потым да істэрык...

## Трыялет

Мне ўсё адно, чыім быць лёсам,
Калі не будзеш ты маім.
Да самай засені хваін
Мне ўсё адно, чыім быць лёсам.

Імчым па коле ці стаім –
Не адказаць кахання слёзам.
Мне ўсё адно, чыім быць лёсам,
Калі не будзеш ты маім.

www.kamunikat.org

* * *

Давай на шырокім ложку
Прасціну, бы снег, рассцелем
І кожны для кожнага трошку
Станем на міг імартэлем.

Давай цалавацца глыбока,
Каб спухлі-ссінелі губы,
Я буду (па Блоку) лёкай
Ці проста твой мілы і любы.

Калі ж тая ноч растане,
Заранка калі астыне,
Давай не патушым кахання
У дзённай халоднай пустыні.

* * *

Восень стаіць на дварэ –
Час незваротна бяжыць.
Нехта раней з нас памрэ,
Нехта павінен пажыць.

Некаму будзе лягчэй –
Хто ўжо дадому сышоў,
З левага ж боку плячэй
Не зарубцуецца шоў.

.........................................

Будзеш мяне ты чытаць
І не адолееш слёз,
Я ж прабяруся, як таць,
Гэтым радком у твой лёс.

## Трыялет

Не спадзявайся, бо ты не памрэш.
Мне распавёў пра такое Вальтэр.
Хочаш не верыць французу – не вер.
Не спадзявайся, бо ты не памрэш.

Страціўся Ъ і страціўся Ь,
Страціцца многа яшчэ тут, але ж
Не спадзявайся, бо ты не памрэш, –
Мне распавёў пра такое Вальтэр.

www.kamunikat.org

* * *

Ты маёй дачакаешся смерці.
Не паверыўшы ў гэтую з’яву,
Будзеш вершы раскідваць, як смецце,
І каўтаць надта горкую каву.

Я зайздросціць табе ўжо не буду,
Як і ты спачуваць мне, дарэчы.
Там Хрыстос напаткае Іуду,
А цябе акаляцімуць рэчы.

Ды аднойчы, напэўна, пад ранак,
Калі раптам не ўзыдзе Венера,
Сярод процьмы аголеных ранак
Ты не знойдзеш ніводнага нерва.

* * *

*Как Вы милы!..*

А. С. Пушкин

Нам лепей застацца на Вы
і думкі выказваць намёкам,
каб змесціва галавы
і сэрца нябачным для вока
было і спакойным для нер-
ваў. Лепей застацца на Вы,
прычым захаваць нежывы
тон гутарак нашых, і вер-
шыкаў не пісаць і тым больш
цябе не знаёміць з такімі,
што выклікаць могуць боль,
якога ўжо сэрца не прыме
і выштурхне ў месцы, дзе швы
пасля накладуць на руцэ.
Супынім жа гэты працэс,
нам лепей застацца на Вы.
Саткуць паасобку ставы
сувоі жыццёвых абзацаў...
Ці лепей застацца на Вы?
То лепей зусім не застацца.

# P. S.

## Раман у паэтычных фрагментах

I. S.

*Как жаль, что тем,*
*чем стало для меня*
*твое существование, не стало*
мое существование для тебя.

*И. Бродский*[1]

[1] Я сам не паверыў бы, але эпіграф да раздзела быў узяты раней, чым я ўбачыў, што назвы майго раздзела і дагэтуль незнаёмага мне верша І. Бродскага супадаюць. Зрэшты, гэта далёка не першае і не адзінае такое супадзенне ў маёй літаратуры і жыцці.



www.kamunikat.org

## Акрасанет

**М**агчыма, я не меў ніколі рацыі,
**І** Боскай воляй ісціна цяпер
**Л**яжыць не ў стосах выцвілых папер,
**А** ў вуснах мілае дзяўчынкі-грацыі.

**Я**шчэ далёка да рэінкарнацыі.
**М**астак, аднак, зямных ды іншых сфер
**А**дкрыў цябе – нібыта напавер, –
**Я** ж не магу пакінуць меж прастрацыі…

**I**ch liebe dich! To be or not to be?!
**Р**асце, расце ўсё ж горыч у грудзёх,
**А**ле – я не магу, як і не мог.

**Ч**аму? – Ня ведаю. Любі ці бі,
**К**алі заўгодна, то што хоч рабі:
**А**статні шанец – гэта ты і Бог!

* * *

Асвяціўся раптам дзень,
Красавік настаў зімою.
Распусціўся б, мусіць, пень,
А мяне няма з сабою.
Вечарэе на дварэ,
Ездзяць людзі туды-сюды.
Раніцою не памрэ
Шчасце веры ў Бога й цуды.

Снежань па календары
Мне падкажа шлях да credo:
Ісціну людзям дары,
Радасць будзе, хлопча, ведай.
Непагадзь амаль прайшла.
О! пакінь ужо маркоту,
Выйдзі з цемры да святла,
Адчыні ў Эдэм вароты…

I am sorry, белы свет.
Распазнай, што гэта – лірыка.
Край радкоў – і ўвесь сакрэт:
Акраверш “СМІРНОВА ІРКА”.

# ПАСЛЯ НЕНАПІСАНАГА

## Дыпціх

## I

### Па-жаданне

*Все то, что я писал в те времена,*
*сводилось неизбежно к многоточью.*
*Я падал, не расстегиваясь, на*
*постель свою. И ежели я ночью*
*отыскивал звезду на потолке,*
*она, согласно правилам сгоранья,*
*сбегала на подушку по щеке*
быстрей, чем я загадывал желанье.

И. Бродский

Апошні раз пагутарым на ты
І разміёмся на шляхах да Бога:
Твая – раўнейшай ад маёй дарога,
А я – палю за спінаю масты.

Але павер (зусім не мне – павер),
Што недарэчнасць размінанняў нашых
Цябе пасля больш за мяне настрашыць,
Хаця табе нябоязна цяпер.



www.kamunikat.org

Апошні раз пагутарым. І мы
Разыдземся, але ў адным напрамку:
Ты – абмінаючы любую ямку,
А я – не зарекаясь от сумы.

Ну вось і ўсё. Далей: устань ды йдзі,
Нясі свой крыж (ён ад майго лягчэйшы –
Спытай пра гэта ў рыкшы альбо гейшы)
І шчасце натуральнае знайдзі.

www.kamunikat.org

## II

## Беспрасветны аптымізм

*Быў гэта толькі сумны сон,*
*што развяду я з ёй бяду,*
*што пад яе напеваў звон*
*лягчэй к магіле дабрыду…*
*Быў гэта толькі сумны сон,*
*што вось інакшая яна*
*і пойме болю майго стогн,*
*зірне ў душу маю да дна.*
*Быў гэта толькі сумны сон…*

Янка Купала

Я пажыву. Да смерці пажыву.
Хоць не прызнаюся, на жаль, табе ў тым,
Пра што б сказалі псіхатэрапеўты:
Спакойна, гэта сон ці déja vu.

Я расчаруюся ў каханні – не ў табе.
І нават вечарам ледзь-ледзь паплачу,
Што долю Бог наканаваў сабачую, –
Каб не тануць у роспачнай мальбе.

Не патану, адчай не апляце
Мяне. А толькі загартуе болей

Душэўнымі пакутамі і болем, –
Калісьці я памёр ужо ў Хрысце.

Я дажыву. Да смерці дажыву.
І гэта – аптымізм. Ці вы нязгодны?
Але, на шчасце, ён зусім бясплодны:
Спакойна, гэта – сон ці déja vu.

www.kamunikat.org

## Акраверш

*Нас ждет не смерть, а новая среда.*

И. Бродский

**I**nter alea, і ты
**L**епей знаеш – з Дабравесця:
**O**mnes homines там дзесьці
**V**ita будуць мець заўжды.
**E**rgo, трохі пахаджу
**Y**а шчэ тут, у асяроддзі, –
**O**vertime зноў нас народзіць
**U** чацвер пасля дажджу.



www.kamunikat.org

## Акрагекзаметры

**І**сціну з вуснаў маіх,
　　　відаць, ты не спасцігнеш ніколі.
**С**ам я не знаю яе,
　　　ды не магу не адчуць.
**Н**е разумею зусім
　　　ані лёсу свайго, ані долі.
**L**upus est – сказана так
　　　пра між людзьмі каламуць.

**І** шчэ без кропак стаіць
　　　і сумуе сярод іншых літар.
**Е** запазычыла дзве
　　　кропкі ў шматкроп'я, адна ж
**В**адаю ў сінтаксісе
　　　дачыненяў, як тэмай закрытай.
**Е**нкі, без клічніка ўжо,
　　　захэпіэндзяць пасаж.

**D**anke schon: горш магло быць.
　　　Gott mit uns?
　　　Ды хутчэй за ўсё zwischen.
**І**ра… ірацыяна… –
　　　гэта не трызненне, не.
**С**амнамбулічнасць радкоў
　　　па краі мовай Фройда апіша
**Н**едагаворанасць слоў –
　　　　　　　　тых, што на сэрцы ў мяне.

* * *

Ты стала лёсам для мяне.
Дакладней, не: ты ім не стала.
І толькі сэрца: то кальне,
А то й расплачацца нястала.

Так і жыву, згубіўшы лёс.
Дакладней, не: яго не стрэўшы.
Не разабраць радка ад слёз,
Якія складваюцца ў вершы.

www.kamunikat.org

## P. P. S.

Калі я існую – то ў пачуцці,
Што не сышло ў нябыт вясной са снегам
І не змагло хоць некуды сысці,
З’яўляючыся Альфай і Амегай.

Я праганяў яго і разам з тым
Так прагнуў. Бачыць болей не жадаў я
Аб’екта пачуцця. Астынь, астынь, –
Казаў сабе. І быццам, бы ад шчаўя,

Крывіўся я ад слёз, якія праз
Неверагоднасць рытму альбо спектру
Стваралі ці той вобраз, ці абраз,
За што душу хацелі прадаць пеклу

Ґероі рэлігійных міфаў. Я ж
Хацеў забыцца, і гарэлка часам
Дапамагала замяніць міраж
На іншы свет – на трохі менш няшчасны…

У пачуцці – аднак жа існую,
Але наступіць і яму – Амега,
І радасць тую сумную маю
Закідае быццё пустэльным снегам.

# КЕПСКАЯ НАВЕЛА

## (ненапісаная элегія)

*Змоўклі вершы мае прад табой:*
*іх красу зацяняюць*
*Рытмы паходкі тваёй,*
*сінія рыфмы вачэй.*

М. Багдановіч

Падзеі і персанажы выдуманыя. На жаль.

Тым летам было надзвычай сумна на вёсцы. Зусім не хацелася тут заставацца надоўга. Настальгічныя пачуцці былі задаволены літаральна на другі дзень. Цягнула ў горад – да студэнцкіх сяброў. Але тыя ж таксама параз'язджаліся хто куды. Таму астатнія студэнцкія вакацыі наперадзе чакалі мяне нудныя.

Яшчэ гадоў колькі таму летам нашае сяло гуло, не раўнуючы, як перапоўнены вулей. Вярталіся тыя, хто недзе вучыўся, на адпачынак завіталі шматлікія ўнукі, падыходзіла моладзь з суседніх вёсак, меншых па памеры. Сельскі дом культуры, ці, як кажуць, клуб, заўсёды быў перапоўнены. У такія, як сёлета, спякотныя дні (ці дакладней пасля іх) да сцен танцавальнай залы нельга было прытуліцца, бо яны былі мокрымі ад скандэнсаванага паветра. А ў дні, калі танцаў не

круцілі, маладыя людзі збіраліся ў пэўных "кропках", дзе пад гітару ці магнітафон спявалі, расказвалі анекдоты, адным словам, радаваліся жыццю, сваёй маладосці.

Цяпер усё перавернута з ног на галаву. Грошай на культурныя мерапрыемствы для сяла выдзяляецца ўсё менш ды менш. Работнікі клуба сталі гнаць шчырую халтуру пад прыкрыццём усялякай паказухі перад начальствам. Калгас знаходзіўся на мяжы развалу, і да моладзі яго кіраўніцтву не было ніякай справы.

Ад бяздзейнасці мае пагодкі пачалі співацца. Яны боўталіся цэлымі днямі ў пошуках спіртнога ці якой магарычнай справы. Таму "тусавацца" з імі значыла падвяргаць сябе небяспецы быць уцягнутым на дно шклянкі. Такі вобраз жыцця мяне не спакушаў, хоць не сказаць, каб я быў абстынентам. Засталіся кніжкі і часопісы мясцовай бібліятэкі.

У першыя дні прыезду, заспеўшы сена, з задавальненнем пашчыраваў на сенакосе. Вечарамі ж нікуды не выходзіў, а круціў тэлевізар. Аднак ён хутка надакучыў. А кніжкі за цэлы дзень стамлялі, і тады хацелася неяк развеяцца.

Суседка, дзеці якой ужо зладзілі свае сем'і, усё кпіла з мяне, што пры такім вобразе жыцця

назаўсёды застануся самотным. А аднойчы, нібы спахапіўшыся, успомніўшы нешта важнае, пачала расказваць, якая маладая паненка прыехала да адной вясковай бабкі з Польшчы. Паведаміла, што такая ўжо яна разумная – спасу няма! Ведае ажно некалькі моў! Ну, канечне, далей настала чарга агітацыі пазнаёміцца нам і пасябраваць. Мне ўявілася дзявуля ў тоўстых акулярах, настолькі пышная, што здавалася, гэта яе распірае ад розуму. Стала смешна, і я пайшоў дачытваць "Лаліту".

На выхадныя ўсё ж занудзіўся, не вытрымаў і пашураваў у клуб на танцы, хоць знаў, што мае пагодкі іх амаль не наведваюць, зараз туды ходзяць адны школьнікі. Так і было. На ганку і вакол купкамі стаяла моладзь. Адна кампанія залівіста смяялася, другая – напружана слухала нейкую сур'ёзную байку, трэцяя – проста моўчкі, плюючы сабе пад ногі, паліла... Большасць людзей я не пазнаваў, таму і не ведаў, да каго прыткнуцца, з кім завесці гаворку пра вячэрняе "жыццё-быццё" маладых.

– Здароў, студэнт! – вітанне прагучала над вухам, таму я ледзь не спужаўся. Перада мною стаяў аднавясковец, яшчэ нядаўна школьнік, якога я ведаў як даволі дасведчанага па вясковых мерках меламана.

Побач, літаральна за ім, адкрылася вачам, гаворачы словамі любімага Караткевіча, *нешта такое, чаго я ніколі не бачыў і што адразу ўразіла і ашаломіла мяне, як раптоўны ўдар, нешта залатавалосае і сінявокае найбольш як васемнаццаці год. Божа мой! Што гэта за нешта было! Глядзела на мяне сінё і празрыста і ўсміхалася ружовым прыпухлым роцікам з відавочным падкусам, але і адначасова з адценнем заахвочвання*. Гэтыя словы класіка ўсплылі ў памяці праз пару секунд, бо больш нічога так не пасавала да апісання Яе, і, здавалася, што каб я тых слоў не ведаў, то да раніцы абавязкова напісаў бы сам.

Збянтэжаны, я трохі запознена даў "добры вечар" і парукаўся з хлопцам, выклікаўшы сваёй запаволенасцю лёгкія ўсмешкі абодвух. Ямачкі, якія з'явіліся пры гэтым за куточкамі непаўторна захапляльных вуснаў, яўна збілі са звыклага рытму мой пульс, які звычайна быў дакладна, як у маіх добрых знаёмых – Напалеона і Ніцшэ, а менавіта – удар у секунду. Калі адносна супакоіўся, пачуццё захаплення змянілася шчырай зайздрасцю: кахаюць жа некага такія дзяўчаты!

– Нарэшце і ты вылез з-за сваіх кніжак. Выйшаў бы калі, расказаў бы, што новага ў сталіцы. Тут у глыбінцы цяжкавата ўсачыць за развіццём

музыкі. Вось узяць тую ж “Крамбамбулю”. Столькі ўжо чытаў пра яе, а песні дык ніголнае шчэ не чуў. Мо ў цябе е? – і на гэты раз Серж не здрадзіў сваёй традыцыі, пачаўшы з высвятлення сучаснай кан'юнктуры на беларускім музычным рынку. Ды так натхнёна, што склалася ўражанне, быццам забыўся на сваё нядаўняе пекнае візаві.

Зразумела, я вельмі хацеў спадабацца, хаця б і безвынікова, той, ад якой сэрца бессаромна затахкала. Таму быў асабліва рады, што мяне не толькі затрымліваюць, але і даюць магчымасць паказаць сваю эрудыцыю ці, як кажуць у горадзе, “продвинутость”.

– А як ты думаеш? – пачаў я бадзёра, аж, мусіць, занадта. – Ці ж нармальны студэнт зможа абысціся без “Крамбамбулі”[2]? Заўтра падыходзь – возьмеш перапісаць.

– О, супер! Дзякуй! Слухай я зусім забыў. Знаёмся. Хелена. Алена, значыць, па-нашаму. Прыехала з Польшчы наведаць бабцю.

Вось табе і на! А дзе хаця б таўшчэзныя акуляры? Алена нейк эмансіпавана працягнула руку і пасля таго, як прагучала маё імя, амаль без акцэнту, з

---

[2] Крамбамбуля – спіртовы напой беларускай шляхты часоў закату ВКЛ; тут: гульня слоў, бо беларускія музыкі на чале з Лявонам Вольскім выдалі аднайменны музычны праект (заўвага аўтара).

іскрынкай у вачах, быццам прачытаўшы мае думкі пра ўяўленне аб ёй прамовіла традыцыйнае "вельмі прыемна", што паўтарыў я ўжо на польскай мове, маўляў, таксама не лыкам шыты.

Эх! Каторы раз спазніўся. Серж стаяў каля яе на такой адлегласці, якая выходзіла за рамкі сяброўскіх стасункаў. Ва ўсялякім разе, мне так здавалася, і падчас нашай гамонкі пра музыку я, стараючыся не падаваць выгляду, высочваў іхнія рухі, якія пацвердзілі б ці абверглі б мае меркаванні.

Алену, відаць, стаміла наша размова, бо мы перайшлі ўжо ад фольку да вульгарнага панку, і яна адышла да сябровак.

– Як табе дзяўчо? – запытаў Серж, калі мы засталіся адны.

– Чуў, чуў ужо пра яе. Кажуць інтэлектуалістка, паліглот, – як мага нейтральней адказаў я.

– Ды не. Гэта ўсё так. Але дзяўчына – як, спадабалася? – настойлівасць Сержа мне была незразумелая, і я не ведаў, што і сказаць.

Падманваць не было прычыны, але і дыфірамбаў спяваць я не меўся.

– Вельмі прыгожая. Бываюць жа такія, – я нечакана сумна ўздыхнуў, што, мусіць, не прайшло не заўважаным Сержам.

– Ну, дык глядзі – не тармазі. Я дык яшчэ малады, а табе жаніцца ўжо пара па заканчэнні універа. Чым не другая палавіна? – я не разумеў, ці кпіць з мяне Серж, ці гаворыць сур'ёзна.

– Не блазнуй. Па-першае, я не прыхільнік шлюбу наогул, а па-другое, такія дзяўчаты рана замуж не выходзяць, дый шчэ за абы-каго.

Цяпер стала зразумела, што Серж з Аленай былі проста добрымі знаёмымі, але замест таго, каб узрадавацца, я запанурыўся, бо ніякай надзеі на нашае сяброўства не было: яе вясковыя сяброўкі не належалі нават да маіх знаёмых, таму і падстаў для чаго-небудзь большага за вітанне не мелася.

У той вечар мы болей не размаўлялі. Было ясна, што я не яе герой. Зусім выпадкова пачуў, як Серж прапанаваў Алене правесці яе дахаты, і яны пашпацыравалі, не дачакаўшыся заканчэння дыскатэкі. Ну вось... А яшчэ казаў "не тармазі"...

Да раніцы не могучы заснуць, я вельмі шкадаваў, што пацягнуўся ў клуб, а зараз пакутую з-за сваёй паталагічнай пачуццёвасці. З ранку душу пацягнула на лірыку. Я перабіраў паэта за паэтам: С. Ясенін, І. Севяранін, Л. Дранько-Майсюк, П. Элюар... Кожнага чытаў датуль, пакуль не трапляў на

верш, з-за якога пачынаў зайздросціць. Не паэту, не – чалавеку, якога напаткала радасць узаемнага кахання. Збольшага супакоіцца змог адно пад вечар, пачаўшы ставіць на перамену кружэлкі нашай фолькмузыкі – “Крыві”, “Тройцы”, “Ліцьвінаў” і слухаць іх пад берасцейскае піва.

Захмялелы, на гэты раз я заснуў без праблем. Душа, праўда, парывалася на вячэрні праменад, канечне, у спадзеве на выпадковую сустрэчу з Аленай. Аднак розум даводзіў, што такі пасаж быў бы шкодным для маёй псіхікі. Да таго ж супраць выступала цела, якое шчыра хацела адаспацца за мінулую бяссонную ноч. Такім чынам, пры кворуме двума галасамі супраць аднаго я застаўся ў ложку.

Працэс сну, калі можна так выразіцца (а я так ужо выражаўся нейк у інтэрнаце, што вельмі насмяшыла майго “супакойніка” – таго, з кім жыў у адным пакоі, – Андрэя), аказаўся дыскрэтным, гэта значыць, перарывістым: спярша дало пра сябе знаць арганізму піва, а пад раніцу – цяжкія сентыментальныя сны. Бываюць жа і такія!

Дзень браўся на спякоту, мабыць, большую за ўчарашнюю. Куры дзе-каторая ўжо сноўдалі з разяўленымі дзюбамі ў пошуках немаведама

чаго. За сняданкам бацька ізноў панаракаў на людзей, што не хочуць пасвіць кароў на раніцу, а яны там на пашы пакутуюць ад спёкі і слепакоў. Ён з маці забраліся ды пайшлі ў чорныя ягады (з-за якіх, дарэчы, людзі і не гналі кароў з абедным перапынкам, каб не адрывацца ад ягадных заробкаў). Я ж ад чарніц гультайстваваў. Каб сагнаць санлівасць, сеў на ровар і пакіраваў на азярцо скупнуцца. Самы раз, думаў я. Вада шчэ дзецьмі не збоўтана, чысценькая, цёпленькая. Эх! Каб жа яшчэ якая маладзічка склала кампанію! Дню цаны не было б.

Лёс ці д'ябал, нібы пачуўшы маё патаемнае жаданне, вырашыў з мяне пажартаваць. Гэта да мяне дайшло, як толькі паказалася вада. На супрацьлеглым ад таго, да якога я пад'язджаў, беразе загаралі дзяўчаты. Нягледзечы на адлегласць, адну пазнаў... Лепей бы я сюды не ехаў! Сёння адно трохі ўсярэдзіне настала нейкае супакаенне, а тут – наткнуўся на верад. Аленка, Аленка, няўжо ты не магла правадзіцца цэлу ночку, а зараз у сне загараць дзе на Вісле? Не. Абавязкова трэ было прыперціся зранку, калі, я лічыў, дзяўчаты на пляж хадзіць не любяць, бо яшчэ недастаткова ўвагі іх пекным станам.

Ад’ехаўшыся трохі далей, каб не бачыць, паспрабую сказаць паэтычна, соль на сваёй ране, без ценю задавальнення ўлез у незразумела сырую ваду (ужо ж прыехаў, узяўся за гуж ці там яшчэ назваўся грыбам нейкім). Абцёршыся збольшага кашуляй, з імпэтам злоснай спрытнасці ўскочыў на сядло і папедаліў іншай сцежкай дахаты.

Як сцямнела, ведаючы напярод, што заснуць не змагу, вырашыў прасунуцца па сяле. Хацелася сустрэць прыяцеля-другога, каб кульнуць пару грамовак добрага настрою. Тыя часы, калі летнім вечарам у вёсцы можна было знайсці некалькі тусовак, мінулі. Зараз добра, як адна якая ў цэнтры зарганізуецца. Менавіта туды, пад магазін, я і накіраваўся. На прыступках крамы сядзела некалькі чалавек.

– О, студэнт! – не паспеў я павітацца, як мяне пазналі.

Кінуўшы ў сваю чаргу “добры вечар”, хацеў прайсці далей, да аўтобуснага прыпынка, адкуль даносіліся хлапцоўскія галасы. Мяне затрымалі ўсё тыя ж ямачкі ля вуснаў, якія асвяціліся фарамі заблукалай машыны. Трэ было нешта гаварыць, і я звярнуўся да таго мальца, што першым абазваўся, калі я падыходзіў. Ён якраз запальваў.

– А ты ўсё курыш. Памрэш хутка. Спярша пасталей, худы вунь, бы трэска, – пачаў казаць, што першае прыйшло ў галаў, абы гаварыць.

– Затое п'ю менш, чым ты, – патрапіўшы пальцам у неба майго вечаровага мацыёну, адказаў хлапчына.

Ну, вось і пагаварылі. Нарваўся, што называецца. А так хацеў выглядаць рэспектабельна. Толькі перад адной. Перад адной.

Каб замяць гаворку, спытаў, хто там гутарыць на прыпынку, і пайшоў туды. На лаўцы сядзелі былыя вяскоўцы, якія ўжо працавалі хто дзе і зараз, сустрэўшыся дома, выпівалі з гэтай нагоды. Пасля рукання і дзяжурных "як жывеш" прапанавалі чарку. Я падзякаваў і адмовіўся: сорам пасля нядаўняга казусу яшчэ не мінуў. Пастаяўшы дзеля прыліку і выслухаўшы некалькі барадатых анекдотаў, патупаў назад у свой бок. Ведаць, што ты знаходзішся метраў дваццаць ад ямачак, ад якіх з'язджаеш са здаровага глузду, і не мець магчымасці хоць нішчачкам зірнуць на іх, было звыш маёй вытрымкі.

Зразумела, пайшоў я тым самым шляхам. Кампанія сядзела на былым месцы, а малец ізноў запальваў. Устрымаўшыся ад кепікаў, каб самога не выставілі адыёзным, спытаў у яго,

чаму так мала моладзі вечарам на сяле. Хоць і сам ведаў прычыну, таму і не выслухоўваў адказ, думаючы, як загаварыць з той, якая так проста пазбавіла мяне спакою. Сабраўшыся з духам, спытаў:

– А што паненцы спадабалася ў нас?

Алена зразумела, што я звярнуўся да яе.

– Нішто сабе як для разнастайнасці. Можна сказаць, спадабалася. Толькі не спадабалася, што мяне некаторыя называюць паненкаю. Таму на будучыню папрашу называць мяне па імені.

– Прабач, не ведаў. А мне гэтым летам тут ужо надакучыла па самае нельга, – прамовіў я, думаючы над словамі Алены пра будучыню. О! Каб жа яна была ў нас – тая будучыня.

Развітаўшыся як мага спакайней, на гэты раз нідзе не спыняючыся, пайшоў спаць, вельмі перажываючы, што выглядаў далёка не на вышыні тады, калі гэтага хацелася асабліва.

Прачнуўшыся на раніцу з сумна-ўзнёслымі адчуваннямі, канечне, зразумеў іх прычыну. Цікава, што пачаў ужо звыкацца з імі, як хворы з хранічнай хваробай. Таму скарыўся гэтаму, паставіўся па-філасофску, як экзістэнцыялісты да жыцця.

Калі раса спала, паехаў павярнуў ці не астатняе з першай касавіцы лапіка сенажаці. А па абедзе маці выправіла па хлеб. Там як раз прывезлі свежага і, пакуль разгружалі, утварылася чарга, хвост якой выходзіў на ганак і спускаўся з яго пад засень пышных ліпаў.

– Ці не ты астатні? – звонкі голас Алены сваёй нечаканасцю мяне нібы прыглушыў.

Мусіць, я павярнуўся з не ў меру раскрытымі вачыма, бо дзяўчына пырснула смехам (дзякуй Богу, хоць прыязным). Postfactum знаходжу сабе апраўданне толькі ў тым, што сапраўды чарга па хлеб – гэта тое месца, дзе я сама менш разлічваў (але падсвядома ці свядома, відаць, усё ж разлічваў) спаткаць Алену.

– Угу-у-у, – прарыкаў я, нібы калгасны бугай, чамусьці ўтаропіўшыся на яе порсткую грудку пад лёгкай сукенкай. Куды толькі падзелася маё пісьменнае “так” ці экзатычнае для нашых часоў дыялектнае “нале”?

– Мяркуючы па ўсім, у адрозненне ад старажытных рымлян, ты налягаеш толькі на хлеб, – у інтанацыі Алены прачыталіся ноткі з’едлівасці, але ад майго недарэчнага погляду яе шчочкі пакрыліся лёгкай чырванню: яна была без станіка і сукенка не хавала рафінаваную выкшталцонасць прыроды яе цела.

Закід мне быў зразумелы: маўляў, відовішчы мяне не вабілі. Трэ было нейк выкручвацца:

– Ну, чаму? Мне здаецца, што я проста выпадаю з кантэксту нашай вёскі.

– Адкуль ты можаш ведаць, калі нават не спрабаваў у ім пабываць? – задала Алена пытанне з яўным рытарычным адценнем і не чакаючы адказу яшчэ спытала. – Вось вечарамі што робіш? Мусіць, тэле круціш.

– Ды не – чытаю. А што рабіць? – такой бойкай камунікабельнасці ад Алены я не чакаў і нават крыху бянтэжыўся.

– Ну, на танцы ўжо мог бы не ленавацца калі падысці.

“Чаго яна так дапякае? – думалася мне. – Гуляецца? Дык мо самому трохі папрыдурвацца?”

– Калі ты абяцаеш мне танец, то буду на наступных жа! – выпаліў я, сабраўшыся з духам.

– Цудоўна! Але, на жаль, у суботу мы выязджаем у мястэчка да сваякоў, таму давядзецца чакаць нядзелі, – пры гэтых словах у пoглядзе Алены мільганула шкадаванне (ва ўсялякім разе мне хацелася, каб то было менавіта яно). – Аднак вы добра паддаяцеся агітацыі, – а тут я ўжо думаў яна скажа “дрэсіроўцы”, але больш збянтэжыла гэтае “вы”: значыць я не адзін такі. Адказаў жа, канечне, інакш:

– Ха! Канечне, каб кожную дыскатэку быў такі стымул, як танец з гжэчнай па... – успомніўшы, што ёй не надта падабаецца такі зварот, слова “паненка” замяніў, – дзяўчынай, дык не хадзіў бы – на крылах лётаў.

Камплімент, хоць і ў некаторай ступені ўскосны, Алена прыняла прыхільнаю ўсмешкай, упершыню за тыя некалькі хвіляў дэманструючы ямачкі ля вуснаў ва ўсёй іх красе, бо яны з’яўляліся не тады, калі іх гаспадынька смяялася ці тым больш рагатала (эстэтыка гэтай лексемы была зусім не кангеніяльнай у дачыненні да Алены), а менавіта, калі яна ўсміхалася і менавіта з нескладовым “у”, бо то была не нейкая там у-у-усмешка, а ўсмешка.

– Што ж, мне нічога не застаецца, як злавіць цябе на слове.

Я сходу дапяў, што мае на ўвазе Алена, але вушам сваім не верыў і прыкінуўся дурнем:

– У сэнсе? Што я такога сказаў?

– Калі быць дакладным і прамым, то ты паабяцаў наведваць дыскатэку, калі я буду дарыць табе па танцу, – Алена ў чарговы раз мяне збянтэжыла, але не саркастычнасцю, з якой былі прамоўлены астатнія словы, а тым, што іх, відаць, пачулі суседзі па чарзе.

Неўзабаве падышла чарга, і я, перапоўнены мроямі, памчаў дадому. “Ва ўсялякім разе, – думаў я, – сачыць за ямачкамі ля вуснаў, дакранацца да яе таліі, адчуваць пах яе валасоў – ці ж гэта не шчасце?!” “...Поминутно видеть Вас, повсюду следовать за Вами, улыбку уст, движенье глаз ловить...” Самі па сабе ў галаве закруціліся вядомыя радкі Пушкіна, але спатыкнуліся аб слова “влюбленными” (шчыра кажучы, гэтага пачуцця з некаторых пор я баяўся, як агню). Яшчэ мае мроі азмрочваліся тым, што нават адзін танец за вечар – гэта таксама ненадоўга, бо Алене рана ці позна трэ будзе ехаць дамоў. І тады я стараўся не думаць пра перспектыву, што лёгка, дарэчы, атрымлівалася, бо ўсе думкі і пачуцці перабіваліся нецярплівасцю дачакацца *нашага* танца.

Некалькі дзён да нядзелі міналіся адносна спакойна. Затое ў нядзелю я не знаходзіў сабе месца. Чытаць мне было сумна, у карты гуляць – пошла, а купацца нават у такую гарачыню цэлы дзень таксама было немагчыма. Я разумеў, што трачу розум: з-за аднаго танца! было б з-за чаго! Клічнікамі стараўся збіць, прызямліць свой летуценны настрой, які,

прыпадобіўшыся Ікару, хацеў узняцца да неба, да сёмага неба. Маё ratio рыхтавалася да ікараўскага падзення. Сітуацыя нагадвала пачатак сцэнару якога-небудзь меладраматычнага кінафільма ці напаўбульварнага рамана, у лепшым выпадку – аднаго з цёмнапрысадных опусаў Буніна.

Вечарам, баючыся прыйсці заранне, каб не выдаць з галавою сябе, падцягнуўся пад клуб бліжэй да поўначы. Гісторыя паўтаралася. Алена ізноў стаяла побач з Сержам.

– А я што казала! Вось і ён! – яны, аказваецца, спрачаліся, ці акажа мая асоба гонар гэтаму клубу сваім візітам. Алена выйграла.

Я не ведаў, ці крыўдзіцца на іх спрэчку наконт мяне. Але пры ўсім жаданні нейкага пачуцця крыўды і не магло ўзнікнуць. Больш таго, мяне цешыў гэты факт.

Завязалася звычайная, нічым не адметная гамонка. Серж, пагутарыўшы крыху нібы для прыліку, праз хвілін колькі знік. Папраўдзе кажучы, я быў рады такім абставінам, але не ведаў, як сябе паводзіць. Мяне выручыў дыскатэчны рэпертуар. Якраз зайграла нейкая павольная мелодыя. Алена сама праявіла ініцыятыву:

– Дарэчы, дыскатэка падыходзіць да завяршэння, бо нядзеля ж, а не субота, таму павольных танцаў больш можа і не быць. Хадзем.

У танцзале было нялюдна. Але ці то клуб нагрэўся ад дзённае спёкі, ці то ад свайго хвалявання за некалькі хвілін танца на спіне адчуў кропелькі поту. Таньчылі моўчкі. Перакрыкваць дынамікі ёй на вуха я палічыў не надта прыгожым.

Казаць, што я хацеў бы, каб танец працягваўся бясконца, значыць падманваць. Насамрэч ён мне здоўжыўся, і з-за гэтага я нават пакрыўдзіўся на самога сябе – на свае пачуцці.

Па заканчэнні падзякаваў і знарок дэманстратыўна са шкадаваннем уздыхнуў:

– Ну вось, а цяпер да чарговага ўік-энда.

– На жаль, ты памыляешся... – Алена хацела нешта распавесці, але аднекуль з'явіўся Серж і перабіў яе.

Я адно зразумеў: Алена з сям'ёй пакідае нашую вёску да чарговай дыскатэкі, на наступным тыдні.

Пакуль Серж расказваў нейкую смешную свежую гісторыю, я паспеў утаймаваць свае думкі: а на што я мог яшчэ разлічваць?! "Ну і добра!" – астатняе, што падумаў перад тым, як уключацца ў гутарку. Яны ўжо па-дзіцячы спрачаліся, хто з іх больш здольны. Алена даводзіла,

што keміць і ў матэматыцы, а не толькі ў філалогіі. Дапамагчы разабрацца папрасілі мяне. У памяці ўсплыла задачка, расказаная мне некалі сябрам з матэматычнага факультэта:

– Добра, – кажу, – хто першы дасць адказ на наступнае пытанне: на руках дзесяць пальцаў, колькі пальцаў на дзесяці руках?

Алена апярэдзіла:

– Сто!

Серж на момант сканцэнтраваў увагу – і засмяяўся:

– Пяцьдзесят, Алена.

Засмяялася і Алена, какетліва злуючыся на нас.

Неўзабаве дыскатэка скончылася, але моладзь не збіралася разыходзіцца. Стаялі цёплыя ліпеньскія ночы. Як сказаў бы Ільф ці Пятроў, "погода благоприятствовала любви". Ды гэты выраз, як мне здавалася, не ўпісваўся ў рамкі прыстойнасці, таму я прадэкламаваў Ясеніна (у спадзеве, што Алена ведае і пазн*а*е аднаго з самых папулярных расійскіх паэтаў):

Ах, у луны такое
Светит – хоть кинься в воду.
Я не хочу покоя
В синюю эту погоду...

– Як прыгожа. І трапна, – ацаніла Алена і ў сваю чаргу нечакана працытавала Багдановіча ў перакладзе на нямецкую і папрасіла мяне прачытаць аўтэнтык.

– Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы... – выдыхнуў я, гледзячы ва ўважлівасць яе вачэй.

Серж неўпрыкмет для нас, спаслаўшыся на тое, што заўтра яму рана ўставаць везці дакументы на паступленне, пайшоў дахаты.

Засабіраўся і я, бо рабіць мне тут нічога не заставалася, але карцела ўсё ж даведацца час Аленінага ад'езду.

– Да, пора мне домой собираться, / Вечер поздний. Его – не продлить, – успомніўся той самы Багдановіч у перакладзе Спрынчана на расійскую. – Хорошо бы тебе догадаться, / Как не хочется мне уходить, – працягваў я ў думках.

– Ты, пэўна, ведаеш на памяць шмат вершаў, – Алена, як падалося, не звярнула ўвагі на сэнс маіх слоў.

– Не так багата, як хацелася б. Але да наступнай раніцы хапіла б чытаць без перапынку.

– Якраз да майго ад'езду...

– Дарэчы, калі не сакрэт, у чым справа?

– Ды тату патрэбна па працы. Мы і так тут з месяц адпачывалі. Добра ў вас. Людзі

цікавыя... А нядаўна пазнаёмілася з адным маладым чалавекам, які, калі верыць яго эківокам, сёння будзе чытаць мне да раніцы вершы па памяці.

Папраўдзе кажучы, я не адразу і скеміў, што Алена мела на ўвазе мяне. Тады ў душы я нават усміхнуўся: калі б такія дыялогі апісваліся ў якім-небудзь апавяданні, то гэта выглядала б занадта штучным.

– Ды табе, мусіць, – пачаў неўзабаве я няўпэўнена, сумняваючыся, ці патрэбна мне наогул гаварыць гэта, – трэ дадому – адпачываць перад дарогай.

– За мяне не хвалюйся. У дарозе і адпачну. А зараз падыдзем, я развітаюся з сяброўкамі.

Наступныя хвілін колькі я стаяў каля купкі дзяўчат і выслухоўваў абяцанні не забываць, пісаць etc. Яны парываліся правесці Алену, але, глянуўшы ў мой бок, зразумелі, што гэта было б лішнім.

– Вось і ўсё. Хорошо бы тебе догадаться, / Как не хочется мне уходить, – прамовіла Алена, хітра прышчурваючыся і бянтэжачы мяне тым, што зразумела ход маіх нядаўніх думак. – Не здзіўляйся, Багдановіч – мой любімы паэт. А ў перакладзе на расійскую яго томік набыў мне гэтым летам тата ў Мінску.

Далей... Далей мы кружлялі па вёсцы. Як і абяцаў, я чытаў вершы, устаўляючы паміж імі свае, каторыя – уявіце, як было прыемна! – Алене падабаліся найбольш. Можа, чытаючы, я ўкладаў у іх болей экспрэсіі? Ды ў тым, што яны мае, не прызнаваўся, бо многія з іх былі прысвечаны некалі адзінай.

Пасля трыялета пра *доўгае растанне з Вамі* наступіла паўза (яшчэ я падумаў, што ўсё адбываецца проста-такі па законах жанру, для чаго бракавала толькі чорных кос). Мне так хацелася, каб нашае маўчанне было на адну тэму. На гэты конт я нават загадаў жаданне пры падзенні малюсенькай зорачкі. Яшчэ праз колькі крокаў няўрокам, зусім нечакана для нас абодвух, як у кепскай навеле, нашы рукі судакрануліся па ўсёй іх даўжыні ад локця да пальчыкаў, якія на момант, неяк інстынктыўна былі перапляліся. Мне стала непамысна, быццам я свядома ўчыніў нешта непрыстойнае. Але адначасова і прыемна: гэта была, бадай, тая мяжа, за якую я не магу пераступіць у першы вечар. Мой твар спунсавеў, і я дзякаваў Богу, што поўня схавалася за воблачка, гэта значыла, збянтэжанасць застанецца незаўважанай. Алена ж, пакуль я чырванеў, павярнула свой тварык у мой бок і, як здавалася,

уважліва глядзела мне ў вочы, ўсміхаючыся сваімі ямачкамі ля вуснаў.

– Ты такі... – далей я чакаў пачуць што-небудзь з разраду “незвычайны”, “цікавы”, “не такі, бы ўсе” і да т. п. (у пасцелі да гэтагу шэрагу дадаецца “ты сумасшедший”), – але Алена нечакана змоўкла.

Наступіў казусны момант, у які каму-небудзь трэ было хоць нешта сказаць. Я гэта адчуў, але яшчэ не авалодаўшы сабою пасля той збянтэжанасці, паддаўшыся падману фармальнай логікі, выдавіў:

– Што... я?

Яна залілася лёгкім смехам. Спынілася ні з таго ні з сяго, узяла маю далонь.

– Хочаш пагадаю? Я ўмею, – сказала яна так настойліва, што можна было ставіць клічнік.

Я стаяў агаломшаны такім паваротам, але, зразумела, рукі не аднімаў. Мне спярша нават і ў голаў не прыйшло, што пры тым кволым сяйве не відаць толкам не толькі ліній на далоні, але і самой далоні!

Яна ж і не збіралася ў яе ўглядацца, так і стаяла, перабіраючы мае пальцы. Сітуацыя нагадвала студэнта, які спадзяваўся на падказку ў час экзамену. Студэнтам, які яўна “плаваў”, быў я.

Яна працягвала глядзець мне ў вочы, нібы чакаючы адказу па выцягнутым білеце. “Па законах фізікі такога... цёмначы... не павінна быць!” – праз імгненне лямантаваў мой розум. А *яно*, *такое*, якое не паддавалася ніякім законам, было. Мой непаваротлівы язык урэшце дапамог голасу, які раптам зрабіўся чужым, амаль шэптам, але з няўдалай прэтэнзіяй на жартаўлівы тон, вымавіць:

– Якія вынікі? Што... я?

– Ты? – у яе голасе пачуліся ноткі здзіўлення. Яна выпусціла з далоняў маю руку, за долю секунды паправіла валасы, што быццам бы перашкаджалі вачам, і адначасова з абдымкамі маёй шыі прамовіла.

– Ты... дурань...

Я хацеў сказаць, што гэтаксама сто гадоў таму Ядвіся абазвала Лабановіча ў гэтай жа палескай глушы, і каб паспеў так зрабіць, то сапраўды быў бы несусветным дурнем. Вусны мае дакрануліся да кубачка, перапоўненага жарсцю...

Наступныя гадзіны дзве мінулі ў суправаджэнні дыялогаў, якія складаліся з рэдкіх, абарваных часта на паўслове фраз, змест якіх зводзіўся да недарэчна-дарэчных лынькоўскіх “ой, як позна-позна, ды як рана-рана” (у фармальным сэнсе да лынь-

коўскіх, бо за пацалункамі забыліся не толькі ўсе беларускія і небеларускія пісьменнікі, а і наогул існаванне нейкага універсуму па-за намі). Гадзіны дзве для мяне існавалі толькі маленькая, зграбная грудка, якая свяцілася дзвюма плямачкамі смачкоў на лапіках белага, незагарэлэга фону, грацыёзная, пачуццёвая шыя і ямачкі за куточкамі вуснаў, якіх я не бачыў, але так ясна ўяўляў. Ад пупочка да вочак я выцалаваў яе ўсю. Мы абое былі п'яныя ад шчасця, але наша замучаная такімі гульнямі фізіялогія патрабавала большага, якога пасля некалькіх маіх спроб Аленка здзяйсняць не дазваляла. І толькі перад самым світаннем, ледзь чутна заплакаўшы праз салодкую цяжкасць дыхання, увасабленне пяшчоты, выслізгнуўшы з-пад маіх вуснаў, перакуліла мяне на спіну і расшпіліла маю папружку.

– Я буду шкадаваць у любым выпадку, – надрыўным шэптам мовіла Аленка, – дык няхай жа гэта будзе выпадак шчаслівы для нас да самых магчымых межаў, – апошнія словы захлынуліся ў пацалунку...

Збольшага выцверазіла нас хуткая заранка. Самі таго не заўважыўшы, мы моўчкі сядзелі на беразе сажалкі, да якой падыходзіў калгасны сад. Аленка, па-ранейшаму аголеная, тулілася да маіх

плячэй сваёй спінкай. Мае рукі гладзілі яе спераду, не даючы сырасці ранішняга туману дакрануцца да грудак і пупочка, праз якія на дзве гадзіны я забыўся на Сусвет.

Трэ было разыходзіцца. Мне – дадому спаць. А майму шчасцю – рабіцца недасягальным. Назаўсёды.

Як ні дзіўна, пры развітанні не было і ценю меладраматычнасці. Мы прадоўжылі нашу радасць сапраўды да самых магчымых межаў, нават у астатнія імгненні свецячыся ўсмешкамі, быццам увечары нас чакала новае спатканне. І на развітанне не пацалаваліся, саромеючыся таго, што падгледзяць ейныя родныя, якія павінны былі ўжо ўстаць ды збірацца ў дарогу, – толькі горача пераплялі свае далоні, тыя самыя, што спужаліся адны адных пры нечаканым судакрананні, і ўжо іншыя – смелыя і нечужыя.

Адрасоў (у тым ліку e-mail’аў) вырашылі не пакідаць, каб не вярэдзіць душу, бо сяброўства паміж намі не атрымалася б. І толькі дзве бардовыя плямачкі з унутранага боку крыса маёй курткі мне засталіся на памяць. І ніякімі сродкамі іх нельга было змыць – з маёй банальна-сентыментальнай душы.

*2002*

www.kamunikat.org

Літаратурна-мастацкае выданьне

**Анатоль Трафімчык**

# ЛІРЫКА ЛІРЫКА

Кніга адрэдагавана аўтарам
Дызайн-макет Уладзіміра Гундара
Карэктар Алена Белая

У дызайне вокладкі выкарыстана праца мастака

Зміцера Машчука

Падпісана да друку 27.11.2007
Фармат 60Х84/16
Папера афсетная
Гарнітура Nimrod, Helvetica
Рызаграфія
Умоўных друкарскіх аркушаў 3.8
Улікова-выдавецкіх аркушаў 4,092
Наклад 150 асобнікаў.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Заказ № 785

Надрукавана ў ВЦ "Новая школа"
214020, Расійская Федэрацыя,
г. Смаленск, вул. Смальянінава, 12
www.kamunikat.org